КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №1 (177)
◂ 15 СТУДЗЕНЯ ◂ 2010 г.

# Новы Час



**ПАЛІТЫК СЯРГЕЙ САЛАШ**

Стар. 6

**СВЯТАЯ ЛІЧБА**

Наша Улада — адзіная і непадзельная. Яна па-за рацыянальным мысленнем, яна сакральная

Стар. 4

**ГУМАННАЯ СМЕРЦЬ**

Новы метад смяротнага пакарання апрабавалі ў штаце Агайо на Кенеце Бірасе

Стар. 12

**КАРТУЗІЯ СВЯТОГА КРЫЖА**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**АЛЕГ ВОЛЧАК**

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Трэці сектар у асобах»

▸ **АД РЭДАКТАРА**



# ШЛЯХАМ ГАДОЎ

Аляксей КАРОЛЬ

**Чароўнае свята — Божае Нараджэнне і Новы год. Плынь часу быццам спыняецца. На некалькі гадзін, дзён… Канікулы. Перадышка. Чарга спраў, якія яшчэ ўчора здаваліся гарачымі і звыштэрміновымі, адкладваюцца. Па нейкай агульнай дамоўленасці. Гэта ўжо за гады-дзесяцігоддзі, а мо і стагоддзі, увайшло ў звычку, сталася традыцыяй.**

І нічога надзвычайна дрэннага не здараецца. Хутчэй, наадварот. Такая вось своеасаблівая навагодняя карэкцыя працэсаў, якая незаўважна, у доўгатэрміновым развіцці, дае свой плён — да перамен. Урэшце да лепшага. Недарэмна ж гісторыкі ў хаваналогіі выдзяляюць дзесяцігоддзі, дваццаціпяцігоддзі… Такі вось гістарычны аптымізм.

Якія ж працэсы і тэндэнцыі вызначалі шлях Беларусі–2009 і будуць мець працяг пасля навагодняй перадышкі? І якім будзе працяг? Аналітыкі даюць розныя каментары. Мае — у рэчышчы гістарычнага аптымізму. І на тое ёсць важкія падставы, нягледзячы на існуючыя пагрозы.

З перакрыжавання шэрагу супярэчлівых падзей, якімі быў адзначаны 2009 год, я б выдзеліў дзве асноўныя тэндэнцыі. Па-сутнасці, спрадвечныя для Беларусі, але пакуль далёка не завершаныя — барацьбы за незалежнасць і за дэмакратыю.

Шляхам гадоў, праз катастрофы паўстанняў, рэвалюцый і войнаў, праз цемру таталітарызму, гойдаючыся на арэлях паміж Захадам і Усходам, гераічнымі высілкамі не аднаго пакалення нацыянальных адраджэнцаў, Беларусь усё ж такі дайшла да сваёй дзяржаўнай незалежнасці.

Такім чынам, была, па-сутнасці, рэалізавана галоўная мэта нацыянальнай ідэі, дакладна сфармуляваная яшчэ на пачатку XIX стагоддзя. На жаль, рэалізаваная ў форме аўтакратыі, а не дэмакратыі. Але ж і пры такіх неспрыяльных палітычных абставінах гэта ідэя аказалася мацнейшай за памкненні аўтарытарнага правадыра абмяняць незалежнасць краіны на крамлёўскі пасаг для сябе. Здолела стрымаць накат ілжэінтэграцыйнай хвалі.

2009 год можна лічыць яшчэ адным крокам па шляху ўмацавання незалежнасці. Хаця і вельмі супярэчлівым. Ролю абаронцы суверэнітэту, насуперак уласнай волі, выключна дзеля самазахавання, мусіў узяць на сябе аўтарытарны рэжым А. Лукашэнкі. І таму з усёй сілы імкнецца перакроіць нацыянальную ідэю на свой капыл і можа ў любы момант наогул адмовіцца ад яе ці выставіць на продаж.

Аднак рэжыму толькі здаецца, што ён авалодаў нацыянальнай ідэяй і рухам за незалежнасць і дэмакратыю. Безумоўна, аслаблены і выцеснены па-за сістэмныя рамкі пад ударамі рэпрэсій рух гэты, па адпрацаванай за стагоддзі схеме, перамясціўся з палітычных структур у культурна-асветніцкае рэчышча. Але ад гэтага яго ўплыў на самасвядомасць грамадства ў прынцыпова новых умовах здзейсненай дзяржаўнай незалежнасці, пры існаванні сучасных інфармацыйных тэхналогій, не толькі не зменшыўся, але нават і ўзмацніўся. Сацыялагічныя апытанні, праведзеныя Беларускім даследчым інстытутам стратэгічных даследаванняў сумесна з лабараторыяй «Новак», засведчылі рост нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва.

Разам з тым нацыянальны адраджэнскі рух захаваў і свой рамантычна-дзейны, ідэйны дух, што найбольш яскрава праявілася ў дзесятках фактах вывешвання ў 2009 годзе бел-чырвона-белых сцягоў у розных гарадах Беларусі. Учынак Сяргея Каваленкі, які на вачах усіх, сярод белага дня, усталяваў сцяг на 35-метровай елцы ў Віцебску, меў шырокі грамадскі рэзананс сімпатый. Не лічыцца з гэтым духам улады проста не могуць, таму і вызвалілі з-пад арышту Сяргея.

Пад знакам торгу беларускага аўтарытарнага рэжыму, дзеля свайго самавыжывання, на абодва бакі — Усход і Захад — прайшоў увесь 2009 год. Новыя кулямётныя чэргі (дзякуй Богу, пакуль толькі славесныя) беларуска-расійскіх нафтавай і малочнай войнаў, што прагучалі на яго зыходзе, гэтаму лішняе пацвярджэнне.

Разам з тым сусветны эканамічны крызіс, з бачнай ужо для ўсіх відавочнасцю, выявіў міф пра беларускі эканамічны цуд. Ён узарваў сітуацыю славутай беларускай стабільнасці — стабільнасці стаячага аўтарытарнага балота. І ён жа вымушае да пераменаў і ўскладняе гандаль. Бо той жа крызіс узарваў сітуацыю і ў Расіі, што, па меркаванні расійскага эканаміста Міхаіла Хазіна, стварае магчымасць «урэшце пачаць ствараць нешта разумнае, добрае».

Ва ўсялякім разе расійская халява для беларускага рэжыму калі не скончылася зусім, то істотна зменшылася. І наўрад ці ён здолее замяніць страты халявай з Захаду. Хаця менавіта такія папрокі на адрас ЕС — у ратаванні рэжыму праз рэал-палітык — і гучалі ў мінулым годзе з боку некаторых апазіцыйных беларускіх дзеячаў.

Тым не менш у гісторыі адносін Беларусі з Захадам 2009 год зойме асобае месца, як год пераходу ўладнай групоўкі ад палітыкі самаізаляцыі да палітыкі супрацоўніцтва. Вымушана, як імітацыя, пад ціскам унутраных і, галоўнае, знешніх абставін. Але ж менавіта гэты пераход ёсць прыкметай агульнай тэндэнцыі — эрозіі рэжыму, працяг якой абяцае і год 2010.

Захад жа ад перабольшаных спадзяванняў у пачатку года на эканамічны чыннік ціску на рэжым у бок лібералізацыі ўзмацніў чыннік палітычных патрабаванняў напрыканцы года.

Так сыходзяцца тэндэнцыі — умацавання дзяржаўнай незалежнасці, знешняга ціску з Захаду і Усходу, з тэндэнцыяй набліжэння беларускага рэжыму да яго фінальнай стадыі. Але колькі яна будзе цягнуцца, які фармат прыме, на жаль, пакуль пралічыць немагчыма.

Сусветны эканамічны крызіс выявіў міф пра беларускі эканамічны цуд. Ён узарваў сітуацыю славутай беларускай стабільнасці стаячага аўтарытарнага балота

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### БРЭСТ. АДСВЯТКАВАЛІ — І НА ЛЫЖЫ

Для грамадскіх і палітычных дзеячаў Брэста і вобласці стала добрай традыцыяй пасля навагодніх і калядных святаў ладзіць лыжныя спаборніцтвы, у якіх удзельнічаюць і дарослыя і дзеці. Сёлета месцам правядзення стала Брэсцкая крэпасць. Лыжня, на думку яе ўдзельнікаў, атрымалася. Гэтаму паспрыяў невялікі мароз і лёгкі снег.

### АШМЯНЫ. НАЗВАНЫ ЛАЎРЭАТЫ

Прадпрыемствы паўночна-заходняй Беларусі трапілі ў спіс лаўрэатаў прэстыжнай узнагароды «Выбар праекта «100 дарог», якая ўручаецца беларускім парталам TUT.BY і рэдакцыяй лічбавага часопіса «ЕТ CETERA». Найбольшы гонар дастаўся Ашмянам, дзе знаходзяцца аж два лаўрэаты: ААТ «Ашмянскі мясакамбінат» і Конна-спартовы комплекс «Гіпіка». Агулам у спісе лаўрэатаў — 20 рэгіянальных арганізацый і кампаній, якія заслужылі ўзнагароду неацэнным унёскам у развіццё рэгіянальнага бізнесу і павышэнне сацыяльнага ўзроўню развіцця краіны.

### АСТРАВЕЦ. БАРАЦЬБА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Мясцовы праваабаронца Іван Крук звярнуўся з лістом у Вярхоўны суд і просіць адмяніць буйны штраф, якім яго пакаралі за распаўсюд выданняў без выходных дадзеных. Сваю просьбу ён матывуе тым, што праваахоўныя і судовыя структуры парушылі артыкул 33 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і артыкул 5 «Закона аб СМІ», якія гарантуюць свабоду меркаванняў, перакананняў і іх выяўленне. Да таго ж, пры складанні пратакола міліцыянтамі былі дапушчаны істотныя працэсуальныя парушэнні, а раённы суд вынес пакаранне больш чым праз два месяцы пасля здзяйснення «правапарушэння». На думку Івана Крука, выданні «Мірны атам», «Астравецкі веснік», *«Глоток воздуха»*, за перадачу якіх суседу ён быў пакараны, не з'яўляюцца сродкамі масавай інфармацыі, паколькі не друкуюцца перыядычна. Акрамя таго, гэтыя газеты не ўяўляюць ніякай небяспекі для дзяржавы, звычаяў і маралі грамадскасці.

### БРАСЛАЎ. УСЁ ПРА ВЯСЕЛЛЕ

9 студзеня ў Браслаўскім музеі традыцыйнай культуры адкрылася выстава «Вяселле: традыцыі і сучаснасць», зладжаная студэнцкім этнаграфічным таварыствам. Сярод шматлікіх экспанатаў даўнія і сучасныя фотаздымкі вяселляў, якія ладзіліся традыцыйна. Дэманструюцца і сучасныя шлюбныя ўборы, але з арнаментальнымі дадаткамі. Наведвальнікі змогуць параўнаць старажытныя і сучасныя элементы вясельнага абраду.

### ЛІДА. ПРЭМІЯ МУЗЕЮ

Напярэдадні Новага года прэзідэнцкай прэміяй «За духоўнае адраджэнне» ўзнагародзілі шэраг калектываў і асоб. Сярод іншых і Лідскі гісторыка-мастацкі музей за распрацоўку і рэалізацыю музейна-асветніцкай праграмы «Старадаўніх муроў адраджэнне». Праграма рэалізоўвалася на працягу года і мела на мэце паказаць вялікую гістарычную спадчыну гэтага краю. У межах яе праводзіліся экскурсіі па Лідскаму замку. Зладжана выстава адной вуліцы — вуліцы Віленскай. Экскурсаводы асвятлялі тры перыяды яе існавання: царскі, за польскім часам і пасляваенны. Былі таксама выстаўлены экспазіцыі, прысвечаныя заснавальніку горада князю Гедыміну, і шэраг іншых. Большасць экскурсій праводзілася на беларускай мове.

### ПАСТАВЫ. ПРЫБРАЛІ СМЕЦЦЕ

Актывісты Руху "За Свабоду" і іншых грамадскіх арганізацый Пастаў і Віцебска арганізавалі прыборку смецця на тэрыторыі габрэйскіх могілак, якія, на іх думку, з'яўляюцца гістарычным помнікам і патрабуюць належнай увагі з боку камунальных службаў горада. Пакуль жа ні райвыканкам, ні камунальныя службы не дбаюць пра габрэйскія пахаванні, што месцяцца ў 300 метрах ад цэнтра горада. Паводле ўдзельнікаў мерапрыемства, уладам і грамадскім арганізацыям яшчэ трэба правесці вялікую працу па добраўпарадкаванню могілак, каб іх не сорамна было дэманстраваць турыстам.

ТЭНДЭНЦЫЯ

## «МАЛАДУЮ БЕЛАРУСЬ» НЕ ЗАРЭГІСТРАВАЛІ

**Міністэрства юстыцыі не зарэгістравала рух «Маладая Беларусь». Пра гэта паведаміў адзін з лідэраў аргкамітэта па стварэнні руху Дзмітрый Каспяровіч.**

Паводле яго слоў, дакументы на рэгістрацыю ў Мінюст былі пададзены 7 снежня 2009 года. «Нягледзячы на тое што месяц, які даваўся для адказу, прайшоў, ніякай рэакцыі з боку Мінюста не было. Таму я прыйшоў сёння ў Мінюст, дзе мне паведамілі, што адмова ў рэгістрацыі была выслана па пошце ўчора, 11 студзеня. Падрабязнасці аб прычынах адмовы ў рэгістрацыі мне не паведамілі, заявіўшы, што я ўсё даведаюся з ліста», — сказаў Каспяровіч.

Ён адзначыў, што пасля атрымання ліста аргкамітэт па стварэнні «Маладой Беларусі» вырашыць, абскарджваць адмову ў рэгістрацыі ў Вярхоўным судзе або не. Таксама будзе вырашана пытанне аб магчымасці правядзення паўторнага ўстаноўчага з'езда арганізацыі.

Каспяровіч дадаў, што рух «Маладая Беларусь», хутчэй за ўсё, будзе зарэгістраваны ў Літве ў якасці міжнароднай арганізацыі. «Мы ўжо выканалі ўсе фармальнасці і падалі дакументы на рэгістрацыю руху ў Літве. На наступным тыдні арганізацыя ўжо можа быць зарэгістравана там», — зазначыў ён.

8 лістапада ў адным з мінскіх гатэляў прайшоў устаноўчы сход руху «Маладая Беларусь». На ім прысутнічалі 53 дэлегаты з Мінска, Мінскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Віцебскай абласцей. На пасаду старшыні руху былі вылучаны кандыдатуры Дзмітрыя Каспяровіча і Артура Фінькевіча. Шляхам адкрытага галасавання за Каспяровіча прагаласавалі 40 прысутных, за Фінькевіча — 10, трое ўстрымаліся. Былі абраныя кіраўнікі рэгіянальных арганізацый «Маладой Беларусі». Актывісты новага руху аднагалосна прынялі рашэнне браць удзел у мясцовых выбарах, а таксама рыхтавацца да прэзідэнцкай кампаніі.

Адзін з лідэраў арганізацыі Артур Фінькевіч заявіў, што ва ўстаноўчым сходзе не бралі ўдзел ні ён сам, ні каардынатары руху. Больш таго, паводле яго слоў, Цімафей Дранчук і Дзмітрый Каспяровіч былі выключаны са складу аргкамітэта па стварэнні арганізацыі яшчэ 11 красавіка 2009 года. «Такім чынам, ніякага дачынення да «Маладой Беларусі» гэтыя людзі не маюць», — мяркуе Фінькевіч.

**БелаПАН**

ЖЫЦЦЁ

## ЛЮДЗІ ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ ПРАЦЫ

**Іван БАРЫСАЎ**

**У сярэдзіне снежня мінулага года філіял № 701 ААТ «ААБ Беларусбанк» у гарадскім пасёлку Бялынічы быў далучаны да філіяла № 718 ААТ «ААБ Беларусбанк» у Магілёве і ператвораны ў цэнтр банкаўскіх паслуг.**

У выніку рэарганізацыі, якая адбылася згодна рашэння Назіральнага савета ААТ «ААБ Беларусбанк», без працы ўжо засталося дванаццаць чалавек з персаналу банка, бо непатрэбнымі апынуліся цэлыя аддзелы гэтай установы. На словах супрацоўнікаў, у бліжэйшы час будуць звольненыя ў сувязі са скарачэннем штату яшчэ чатыры чалавекі.

Такі вось сумны падарунак людзі атрымалі да Новага года.

У сувязі з далучэннем да Магілёўскага філіяла № 718 на працягу некалькіх дзён фактычна не працавалі ашчадныя касы ў вясковых населеных пунктах нашага раёна. Людзі не маглі заплаціць камунальныя плацяжы, зняць грошы з банкаўскага рахунка, абмяняць валюту. Як тлумачылі самі супрацоўнікі аддзяленняў, затрымкі адбыліся ў выніку таго, што кампутары не адразу змаглі перавесці на новае праграмнае забеспячэнне.

Нагадаю, што крыху раней у раённай газеце «Зара над Друццю» быў змешчаны артыкул «Няма падстаў для хвалявання», у якім дырэктар філіяла № 701 Святлана Арахоўская паведамляла, што праблем у сувязі з рэарганізацыяй не будзе.

Не думаю, што так лічаць звольненыя з працы людзі, многія з якіх адпрацавалі ў банку шмат гадоў. Якраз у іх і з'яўляцца вялікія праблемы і падставы для хвалявання, бо знайсці якую-небудзь працу з прыстойным заробкам у Бялынічах вельмі цяжка. Гэта толькі наша вельмі аб'ектыўная статыстыка паведамляе, што беспрацоўе ў гарадскім пасёлку імкліва набліжаецца да нуля...

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## НАРЭШЦЕ АБ'ЯДНАЛІ

**Сяргей СЕМЯНОВІЧ**

**Напрыканцы мінулага года ў Бялыніцкім раёне нарэшце скончылася шматгадовая эпапея з далучэннем саўгаса «Іскра» да «Новай Друці».**

На агульным сходзе акцыянераў ААТ «Новая Друць», які адбыўся ў снежні ў аграгарадку Цяхцін, было прынята рашэнне аб рэарганізацыі ААТ «Новая Друць» шляхам далучэння да яго ААТ «Саўгас «Іскра».

Саўгас «Іскра» ўжо шмат гадоў з'яўляўся фактычным банкрутам, таму раённыя ўлады яшчэ з часоў, калі Бялыніцкім райвыканкамам кіраваў Аляксандр Ільянаў, спрабавалі далучыць гаспадарку да «Новай Друці». Аднак гэтага не вельмі хацеў Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, які з'яўляецца асноўным уладальнікам акцый ААТ «Новая Друць». Зараз жа стала вядома, што банк у хуткім часе перадасць свае акцыі іншаму ўладальніку, таму і ўдалося вырашыць пытанне з аб'яднаннем гаспадарак.

Адно застаецца не вельмі зразумелым: як ААТ «Новая Друць» збіраецца працаваць на такіх вялікіх плошчах? Нагадаю, што ў гэтым годзе, яшчэ да далучэння ААТ «Саўгас «Іскра», «Новая Друць» не змагла ўбраць частку вырашчанай бульбы і кукурузы. А што ж будзе зараз, калі плошча гаспадаркі яшчэ больш павялічыцца, а фінансаванне як дзейнасці паменшыцца?

ПРАЕКТ

## СУПРАЦЬ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ

**Упершыню пачаўся маніторынг дыскрымінацыі геяў, лесбіянак, бісексуалаў і транссексуалаў у Беларусі ў 2007–2009 гадах. Ажыццяўляе працу па маніторынгу Грамадзянская ініцыятыва «Праваабарончы праект «ГейБеларусь» пры ўдзеле Беларускай ініцыятывы за сексуальнае і гендэрнае раўнапраўе.**

Мэта праекта — інфармаванне беларускай грамадскасці і міжнароднай супольнасці пра рэальную практыку парушэнняў правоў, а таксама выпрацоўка рэкамендацый па пераадоленні перашкод рэальнаму карыстанню правамі чалавека. Распрацоўка рэкамендацый для органаў улады Рэспублікі Беларусь, беларускіх грамадскіх аб'яднанняў пра меры, неабходныя для зніжэння ўзроўню гомафобіі і падвышэння эфектыўнасці дзяржаўных гарантый выканання правоў і свабодаў грамадзян незалежна ад іх сексуальнай арыентацыі і гендэрнай ідэнтычнасці.

Падчас маніторынгу парушэння правоў чалавека па прычыне сексуальнай арыентацыі ці гендэрнай ідэнтычнасці за 2007–2009 гады будуць сабраны разнапланавыя дадзеныя рэальных маштабаў і формаў дыскрымінацыі, праведзена экспертная ацэнка бягучай нарматыўнай базы на адпаведнасць міжнародным стандартам. Запланаваны аналіз рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ на прадмет наяўнасці дыскрымінацыйных заклікаў і дэзінфармацыі адносна ЛГБТ.

У сакавіку 2010 года даследаванне будзе апублікавана на беларускай мове, у канцы вясны плануецца выпусціць брашуру па-англійску. У электронным выглядзе брашура таксама будзе даступная і на рускай мове.

Таксама арганізатары даследавання прапануюць у бліжэйшыя два месяца атрымаць бясплатную прафесійную юрыдычную кансультацыю па пытаннях дыскрымінацыі на аснове сексуальнай ці гендэрнай ідэнтычнасці ў розных сферах жыццядзейнасці. Па пытанні кансультацыі ў юрыстаў-праваабаронцаў звяртайцеся па тэлефоне: +375 29 8630000 ці па email: lgbt.belarus@gmail.com.

Калі вы станавіліся ахвярай гвалту або дыскрымінацыі ці вам вядомыя такія выпадкі, просім распавесці пра гэта. Са свайго боку мы гарантуем ананімнасць крыніцы, якая падае інфармацыю. Нам патрэбна ваша дапамога, каб распавесці пра рэальны размах гомафобіі ў Беларусі.

Калі Вы хочаце аказаць сваю падтрымку даследаванню і правядзенню маніторынгу, паведамляйце пра гэта па тэлефоне ці на электронную пошту, згаданым вышэй.

**Паводле прэс-рэліза «ГейБеларусь» http://gaybelarus.by**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# МОЙ ЛЮБЫ ГОРАД МОЖА СПАЦЬ СПАКОЙНА

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Я не люблю Маскву. Мой любы горад — Прага. І зараз, праз нафтавыя канфлікты Беларусі і Расіі, я ведаю, што Прага можа спаць спакойна, нават без размяшчэння на тэрыторыі Чэхіі амерыканскай сістэмы супрацьракетай абароны. Чаму я так лічу? Дык гэта вынікае з паводзінаў як Мінска, так і Масквы.**

Крышку нагадаем перадгісторыю. Расія гатова паставіць у Беларусь для ўнутранага спажывання 6,3 мільёна тон нафты з прадугледжаных балансам на гэты год 21,5 мільёна тон. Астатні аб'ём нафты Масква мае намер імпартаваць з умовай выплаты беларускім бокам 100-працэнтнай экспартнай пошліны.

Беларусь настойвае на адмене пошліны на нафту, заяўляючы, што гэта супярэчыць прынцыпам Мытнага саюза. Мінск просіць павялічыць бяспошлінныя пастаўкі нафты да 30 мільёнаў тон. У адваротным выпадку Беларусь збіраецца павялічыць пошліну на транзіт расійскай нафты да 45 долараў за тону (зараз — 3,9 долара).

У адказ Расія забараніла пастаўкі малака дзесяці беларускіх прадпрыемстваў. Мінск, у сваю чаргу, заявіў, што патрабуе павялічыць аплату за транзіт электрычнасці ў Латвію, Літву і Калінінград у пяць з паловай разоў. Болей за тое, як паведамляе расійская газета «Ведомости» са спасылкай на крыніцы ў «Газпраме» і аргкамітэце «Сочы–2014», беларуская кампанія «Трайпл» адмовілася ад планаў па будаўніцтву біятлоннага комплексу ў Сочы для Алімпіяды–2014. Як паведаміў выданню прадстаўнік адной з кампаній, што будуюць алімпійскія аб'екты ў Сочы, «Трайпл» адмовілася ад будоўлі з палітычных матываў — з прычыны канфлікту ўрадаў Расіі і Беларусі з нагоды паставак нафты.

Нехта можа задаць пытанне: а чаму я так радуюся за Прагу? Дарэчы, не толькі за Прагу, але і за Варшаву? Таму што зараз бяспецы Польшчы і Чэхіі анішто не пагражае! Калі Расія раптам вырашыць пайсці вайной на Польшчу і Чэхію, Беларусь увядзе такую пошліну на транзіт расійскіх танкаў, што ніводны танк туды не патрапіць. Тое ж атрымаецца і з паветранымі калідорамі для расійскіх самалётаў і ракет. Так што сапраўды, мой любы горад можа спаць спакойна.

Непрыемная сітуацыя склалася з беларускім Цэнтрвыбаркамам: назіральнікаў ад гэтай структуры не запрасілі ва Украіну на прэзідэнцкія выбары. «Цэнтральная камісія не атрымлівала запрашэння на выбары ва Украіну, — сказала Ярмошына журналістам 12 студзеня. — Хоць, адразу магу сказаць, ніякага «разрыву дыпламатычных адносін» няма. Больш за тое, украінскі калега ўчора даслаў мне цёплае навагодняе віншаванне. Хутчэй за ўсё, гэта пазіцыя краіны — не запрашаць на выбары назіральнікаў з краін СНД».

На месцы Ярмошынай я б задумаўся, чаму неназваны ёю «ўкраінскі калега» даслаў навагоднее віншаванне толькі 11 студзеня. І чаму на ўкраінскія выбары едзе дэлегацыя беларускіх апазіцыйных палітыкаў і праваабаронцаў у складзе 50 чалавек, а не едуць афіцыйныя прадстаўнікі. Не, канешне, назіральнікі ад беларускага парламента ў межах місіі СНД там будуць, але ж гэта не профільная структура!

На жаль для Ярмошынай, яна атрымала яшчэ адзін «адлуп» — на гэты раз ад Еўрасаюза. Мясцовыя выбары ў Беларусі пройдуць без міжнароднага назірання, заявіла 12 студзеня журналістам старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына. Паводле яе слоў, у кожнай краіны павінна быць паслядоўная тактыка і практыка прыцягнення міжнародных назіральнікаў на выбары. «У Беларусі на мясцовыя выбары міжнародныя назіральнікі не запрашаюцца. Калі мы адзін раз запросім, то не зможам адмовіцца ад гэтай практыкі», — сказала яна.

Ярмошына адзначыла, што ў свеце запрашэнне міжнародных назіральнікаў на мясцовыя выбары не практыкуецца, хоць гэта і не забаронена.

Яна, пэўна, не ведала пра тое, што 11 студзеня вярхоўны прадстаўнік ЕС па знешніх сувязях і палітыцы бяспекі, віцэ-старшыня Еўракамісіі Кэтрын Эштан заявіла, што Еўрасаюз мае намер сачыць за ходам выбарчых кампаній у Беларусі ў 2010 і 2011 гадах.

Так што, нягледзячы на незапрашэнне назіральнікаў, Еўрасаюз будзе сачыць за мясцовымі выбарамі. Для гэтага ёсць шмат інструментаў: офіс АБСЕ ў Мінске, прадстаўніцтва Еўракамісіі, замежныя дыпламаты і гэтак далей. І ўсе яны зробяць высновы па выніках выбарчай кампаніі.

Але самы вялікі аблом здарыўся ў беларускім спорце. Чарговы канфуз перажыла лепшая беларуская біятланістка Дар'я Домрачава: яна зноў страляла не па сваёй мішэні.

Што тут можна казаць? Шкада, канешне, Дар'ю, але трэба быць больш уважлівай. І прыкра, што з першага месца яна скінулася на дзявятае. Бо магла быць з медалём. Дарэчы, і трэнеру трэба нешта зрабіць, каб Домрачава стала больш сабранай.

Але трэба быць большым аптымістам! І шукаць варыянты, як даставіць сабе задавальненне нягледзячы на сцюжу, нафту, газ, выбары і пройгрышы. Як у Віцебску. Там аматары загартоўвання да свята праваслаўнага Раства Хрыстовага прымеркавалі лыжны прабег у паўаголеным выглядзе. 15 лыжнікаў-«маржоў» з аголеным торсам за дзве гадзіны ў сярэднім тэмпе пераадолелі каля 15 кіламетраў. Чакалася, што ў акцыі возьмуць удзел толькі мужчыны, але ў дзень яе правядзення да іх далучыліся тры прадстаўніцы прыгожага полу і некалькі дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Пасля лыжнага прабегу «маржоў», якія распрануліся да купальнікаў і ніжняй бялізны, чакаў яшчэ так званы "гарт-бег" па снезе.

Чарговы купальны сезон віцебскія «маржы», па традыцыі, маюць намер адкрыць 19 студзеня, на Вадохрышча.

Добра, калі можна адкрыць такі сезон адразу пасля таго, калі выскачыш з лазні!




## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ЛІДЗІЯ ЯРМОШЫНА




Ньюсмэйкерам гэтага тыдня з прыцэлам на бліжэйшую будучыню стала старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына. Найперш кіраўніца ЦВК раскрыла сакрэт сістэматычнай паразы апазіцыйных кандыдатаў у выбарчых кампаніях. «Для актыўнага ўдзелу партый у выбарах неабходна, каб у іх былі такія ж актыўныя сябры. Пакуль у партыях у Беларусі будуць адсутнічаць гэтыя якасці, а ў іх кіраўніцтва — жаданне актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці, то і выніку не будзе», — заявіла Ярмошына. Каб не ганьбіць Беларусь з такімі нягеглымі партыямі перад іншымі дзяржавамі, кіраўніца ЦВК паведаміла, што мясцовыя выбары ў Беларусі пройдуць без міжнароднага назірання. Па яе словах, у кожнай краіне мусіць быць паслядоўная тактыка і практыка далучэння міжнародных назіральнікаў на выбары.

### ДАР'Я ДОМРАЧАВА




Лепшая беларуская біятланістка Дар'я Домрачава прымусіла не адно сэрца заўзятараў забіцца хутчэй. Але не ад радасці. Падчас масавага старту ў нямецкім Аберхофе ў заключны дзень чацвёртага этапу Кубка свету яна страляла па чужой мішэні.

Домрачава прыйшла на палігон для стрэльбаў першай, апярэджваючы бліжэйшую суперніцу Тору Бергер з Нарвегіі на 28,1 секунды. Першыя тры патроны беларуска накіравала ў чужую мішэнь. Зразумеўшы, што памылілася, яна пачала страляць па сваёй мішэні, але з двух стрэлаў дакладным быў толькі адзін. Чатыры занесеных у пратакол промахі адкінулі спартоўку за межы першай дзесяткі. Да канца дыстанцыі Домрачава змагла выйсці на дзявятае месца з вынікам 42 хвіліны 31,4 секунды (усяго 7 прамахаў).

У першай тройцы біятланістак — немка Андрэа Хенкель, шведка Хелена Ёнсан і нарвежка Тора Бергер. У агульным заліку Кубка свету лідзіруе Хелена Ёнсан. Домрачава займае сёмае месца.

Стральбой па чужых мішэнях Дар'я Домрачава «грашыла» ў снежні мінулага года ў індывідуальнай гонцы на першым этапе Кубку свету ў шведскім Эстэрсундзе. Тады яна схамянулася пасля першага стрэлу, што дазволіла ёй заняць трэцяе месца. На сваім афіцыйным сайце спартоўка папрасіла прабачэння ў заўзятараў за сваю памылку, зазначыўшы, што наконт сваёй памылкі можа сказаць толькі адно: «No comments».

А яшчэ раней Дар'я запомнілася аматарам біятлону тым, што замест стральбы ў лёжцы адстралялася без промаху ў стойцы. І выніку была вымушана зняцца з гонкі.

### АЛЯКСАНДР БАГДАНАЎ



22 студзеня ў мінскім клубе «Рэактар» упершыню ў Беларусі пройдзе фэст актуальнай музыкі «Можна!». Мерапрыемства пачнецца ў 20.00 і завершыцца толькі ў 6.00 наступнага дня. На адной сцэне за восем гадзін выступіць шэраг калектываў, якія вядомыя аматарам альтэрнатыўнай ад афіцыйнай 75-працэнтнай беларускай папсы музыкі. Гэта гурты «Срэбнае Вяселле», «Партманэ», «Адыс-Абеба», «Botanic Project», «Касіяпея», праект «RockerJoker», «CherryVata», «Мох» і «Нагуаль». Зладзіць у Беларусі, не распешчанай разнастайнасцю культурнага жыцця, фэст узялося канцэртнае агенцтва Bo Promo.

Дырэктар прома-групы Аляксандр Багданаў адзначыў на прэсавай канферэнцыі, што не лічыць калектывы, якія ўдзельнічаюць у фэсце, адзіным экспартным музычным прадуктам з Беларусі. Але, на яго думку, у краіне не існуе групаў, аналагічных прадстаўленым. «Яны граюць у арыгінальных жанрах, яны даволі вядомыя як у Беларусі, так і за яе межамі, і не маюць нацыянальных, палітычных межаў. Нашы групы не падпадаюць і пад традыцыйныя жанравыя азначэнні. Не зусім рок, не зусім рэгі, не зусім джаз — група павінна граць не кальку», — падзяліўся сваім меркаваннем Багданаў.

Фестываль «Можна!» двойчы праходзіў у маскоўскім клубе «Ікра» ў 2008 і 2009 гадах. У беларускай версіі «Можна!», па словах арганізатараў, будуць удзельнічаць ві-джэі, будзе візуалізацыя пад кожную групу, мерапрыемства ўпершыню будзе запланавана на ўсю ноч.

▸ АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# СВЯТАЯ ЛІЧБА

Сяргей НІКАЛЮК

**Тэма гэтай «Азбукі паліталогіі» — вынікі 2009 года. Але ўлічваючы, што ахапіць неахопнае — справа няўдзячная, я абмяжуюся Уладай. Наша Улада — адзіная і непадзельная. Яна па-за рацыянальным мысленнем, яна сакральная, а таму ўжыванне вялікай літары ў дадзеным выпадку больш чым дарэчы.**



У апошнія хвіліны сыходзячага года беларусы сустрэліся з Лукашэнкам. Такая традыцыя. Ён прыйшоў у нашы хаты, каб разам з намі «падзяляць радаснае чаканне Новага 2010 года» і падвесці вынікі года, які прайшоў. Гэтым разам чаканні звяліся да формулы: «Крызісы прыходзяць і сыходзяць — **мы** застаёмся!» Хто хаваецца пад займеннікам першай асобы множнага ліку «**мы**» — здагадацца нескладана.

Годам раней асноўная ідэя навагодняга звароту была іншай: «Нашы сэрцы заўсёды адкрытыя для тых, хто ідзе да нас з **дабром**». Такіх у 2009 годзе апынулася няшмат, але быў адзін суб'ект, якога нельга не згадаць. Гэта Міжнародны валютны фонд. **дабра** ён нам прынёс амаль на 2,3 мільярда долараў. Дай Бог яму здароўя!

Апошні навагодні зварот быў па-хатняму цёплым, я б нават сказаў, інтымным. Ніякіх разваг пра «правільнасць абранага шляху», пра тое, што «мы гэтыя гады ўсё рабілі правільна». Параўнаеце: «*У нас есть за что поблагодарить уходящий год. У кого-то родился малыш, кто-то справил новоселье, поступил в вуз, начал собственное дело*».

З пункту гледжання азбукі паліталогіі, такая змена акцэнтаў напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, якія, мяркуючы па ўсім, пройдуць ва ўмовах эканамічнага крызісу, цалкам апраўданая. Падмацую сваю думку выказваннем рэдактара часопіса «The New Times» Яўгеніі Альбац: «Для аўтарытарных рэжымаў характэрна, што ўлада ўсяляк імкнецца вывесці людзей з палітыкі. Гэта і называецца на мове палітычнай навукі "паніжэннем палітычнай мабілізацыі мас" — каб нізы наогул перасталі цікавіцца, што там вярхі робяць».

| КОЛЬКІ РАЗОЎ ЗА АПОШНІЯ 12 МЕСЯЦАЎ ВЫ СУТЫКАЛІСЯ З ЗАТРЫМКАЙ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ ЦІ ПЕНСІІ? | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Варыянт адказу | 09'02 | 09'03 | 03'09 | 06'09 | 09'09 | 12'09 |
| Ні разу | 31 | 53 | 67 | 70 | 73 | 70 |
| Адзін раз | 12 | 9 | 11 | 8 | 10 | 10 |
| Некалькі разоў | 36 | 26 | 17 | 16 | 14 | 16 |
| Штомесяц | 21 | 11 | 4 | 3 | 2 | 3 |

## Узяў слова — трымай!

Рэжым асабістай улады Лукашэнкі, логіка якога, здавалася б, не з'яўляецца таямніцай, да канца года прыемна здзівіў. Склалася ўражанне, быццам расчыніліся нябёсы і на беларускае грамадства абрынулася плынь дзяржаўнай дабрадаці. З 1 студзеня ў рэспубліцы падвышаюцца пенсіі ў сярэднім на 9 працэнтаў (мінулае падвышэнне адбылося ў лістападзе) і дапамога па доглядзу за дзіцём — да 100 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму. Адначасова падвышаецца мінімальная заработная плата і стаўка першага разраду.

Не засталіся на ўзбочыне дзяржаўнай увагі і тыя, хто марыць абзавесціся ўласным жыллём. Для іх прадугледжаны цэлы пакет крэдытных палёгкаў. Бяры не хачу. І ўсё гэта адлюстравана ў бюджэце, г. зн. стала законам. Ці варта пасля гэтага дзівіцца, што асігнаванні на сацыяльную палітыку мусяць (абавязаны) узрасці ў 2010 годзе на 114 працэнтаў!

Беларусы даўно прызвычаіліся вымяраць узровень свайго матэрыяльнага дабрабыту ў доларах. Улада пра тое ведае, таму, малюючы карціну светлай будучыні, не шкадуе «зяляніны». Звернемся да першакрыніцы, да заключнага выступу Лукашэнкі на трэцім Усебеларускім народным сходзе: «*Я убежден, что спустя 5 лет, если мы выполним эти параметры, сможем сказать, что каждый имеет 250, а средняя будет около 500* (выдзелена ў афіцыйным тэксце — С. Н.). *Если мы выполним параметры, которые заложены в программе. А у нас есть для этого всё*».

На момант усенароднага «веча» сярэдняя зарплата складала 250 долараў. У яе падваенне да канца пяцігодкі, паводле апытання НІСПД, верылі тады 60,5 працэнта беларусаў. Скептыкаў яе было амаль у два разы менш — 38,8 працэнта. Да 2009 года ўсё ішло ў штатным рэжыме, але сусветны крызіс зламаў тэндэнцыю. І калі ў рублях рэальны заробак за мінулы год практычна не знізіўся, то яго доларавы эквівалент прыкметна схуднеў.

Здавалася б, адбыўся форс-мажор, і ва Улады ёсць маральнае права адмовіцца ад узятых на сябе абавязкаў. Невыпадкова ў прыведзенай вышэй цытаце рэфрэнам паўтараецца: «калі мы выканаем...» Так, на той момант ва Улады было «для гэтага ўсё», але зараз тое, што было — сплыло, і вонкава выглядае, быццам бы па незалежных ад Улады прычынах. Нездарма ж пра талерантнасць беларусаў ходзяць легенды. Народ і не такое маўкліва праглынаў. Дастаткова ўзгадаць публічнае выказванне Лукашэнкі з нагоды нямецкага парадку, фармаванне якога пры Гітлеры «дасягнула найвышэйшай кропкі».

Але замест таго, каб падсцілаць антыкрызісную саломку, Улада палезла ў бутэльку, палезла па ўласнай ініцыятыве. З нагоды і без яе Лукашэнка стаў нагадваць пра дадзеныя на трэцім Усебеларускім народным сходзе абяцанні. Прывяду выказванне ад 30 снежня: «*Что касается заработной платы, вы знаете, что у нас есть обязательство: средняя заработная плата должна в течение года достичь 500 долларов. Эта цифра святая! Она принята на Всебелорусском народном собрании 5 лет назад. Мы должны это выполнять!*»

Зноў гэты займеннік першай асобы множнага ліку! «Мы застаёмся», і таму «**мы** мусім». Такая формула беларускай Улады ў разуменні самой Улады. Магчыма, шматлікія чытачы здзівяцца, але «моцныя» аўтарытарныя рэжымы, у адрозненне ад рэжымаў «расхлябаных», якія дапускаюць суверэнны плюралізм, залежаць ад насельніцтва. Апошні ж, на думку палітолага Аляксандра Шубіна, «суверэнны перш за ўсё ад абавязкаў перад насельніцтвам». Таму і даводзіцца насельніцтву круціцца ў пошуках заробку, у той час як «уладная і маёмасная эліта засядлала плыні рэсурсаў і ў большай частцы насельніцтва зусім не мае патрэбы».

**«Моцныя» аўтарытарныя рэжымы, у адрозненне ад рэжымаў «расхлябаных», якія дапускаюць суверэнны плюралізм, залежаць ад насельніцтва. Апошні ж «суверэнны перш за ўсё ад абавязкаў перад насельніцтвам». Таму і даводзіцца насельніцтву круціцца ў пошуках заробку**

## Кантрактная сістэма

Перафразуючы Льва Талстога, я адважуся сцвярджаць, што ўсе дэмакратычныя рэжымы падобныя адзін да аднаго, а кожны аўтарытарны рэжым аўтарытарны па-свойму. Па справядлівым назіранні класіка паліталогіі Хантынгтана, адзінае, што іх аб'ядноўвае, — гэта адсутнасць дэмакратычнай працэдуры выбараў. Дакладней, працэдура можа і быць у наяўнасці, але без рэальнага выбару.

У тым, што беларускі рэжым аўтарытарны, сумнявацца не даводзіцца. Так яго ўспрымаю не толькі я, але і сам яго заснавальнік. У якасці доказу працытую стэнаграму выступу перад студэнцкай моладдзю Брэстчыны ад 23 верасня 2004 года: «*У нас очень сильная президентская власть, действительно, с элементами авторитаризма, в этом я всегда честно признавался. Такая у нас Конституция и законы в этот переходный период*».




З нагоды апошніх слоў напрошваецца невялікі каментар. Сучасныя аўтарытарныя лідэры схільныя абвяшчаць свой аўтарытарызм з'явай часовай. Адсюль і «пераходны перыяд». Мауляў, я, зразумела, абедзвюма рукамі за дэмакратыю, але самі разумееце: народ не гатовы, нацыяналісты развалілі эканоміку, ворагі зайздросцяць нашым поспехам. Словам, як дрэннаму танцору, хтосьці або штосьці ўвесь час перашкаджае. Але гэта ўсё для даверлівых вяскоўцаў. У гісторыі яшчэ не было выпадку, каб аўтарытарны рэжым па ўласнай ініцыятыве трансфармаваўся ў рэжым дэмакратычны.

Беларускі аўтарытарны рэжым спецыялісты адносяць да рэжымаў папулісцкіх. Вялікую ролю ў падтрыманні іх устойлівасці адыгрывае своеасаблівы сацыяльны кантракт, сутнасць якога складаецца ў абмене «палітычных правоў і свабод на перараэмеркаванне прыбытку на карысць сярэдніх і малапрыбытковых груп насельніцтва праз дзяржаўна-карпаратыўныя механізмы» (Таццяна Варажэйкіна, сацыёлаг). З прапанаванай дэфініцыі вынікае, што на кантракце ў Беларусі не толькі настаўнікі і ткачыхі, але і Улада. Важнай асаблівасцю дадзенага кантракту з'яўляецца тое, што яго скасаванне па ініцыятыве наймальніка (грамадства) выплаты выходнай дапамогі не прадугледжвае.

## Выпраўленне рэальнасці

Дык чаму ж Улада лезе на ражон? Мой адказ банальны. Беларуская Улада развучылася быць адэкватнай. Больш за 15 гадоў Лукашэнка ішоў «ад жыцця» і неяк неўзаметку кантакты з жыццём згубіў. На фоне эканамічнага росту гэта было незаўважна. Але вось знешні кантэкст змяніўся, і ад улады запатрабаваліся «*глубина понимания событий, ответственность, реализм*» (цытата з афіцыйнай біяграфіі Лукашэнкі), а з імі атрымалася замінка.

Улада сутаргава хапаецца за мінулыя, гадамі напрацаваныя схемы кіравання, паўтараючы пры гэтым загаворы пра адданасць абранаму шляху. Беларуская Улада, як вядома, пабудаваная па вертыкальным прынцыпе. Яна монасуб'ект. У яе няма «галін», а тыя, што фармальна такімі лічацца (Нацыянальны сход, судовая сістэма, дзяржаўныя СМІ), з'яўляюцца правадырамі волі Улады, забяспечваць сувязь з жыццём яны не здольныя.

Замацаваць сказанае дапаможа сацыёлаг Кірыл Рогаў: «Пры дэмакратычным рэжыме, калі рэальнасць пачынае адхіляцца ад прадпісаных ёй палітычнай дактрынай значэнняў, на парадку дня апынаецца абмеркаванне альтэрнатыўных дактрын. Пры недэмакратычным парадку — тэрміновыя меры па выпраўленню рэальнасці».

Праца па «выпраўленню рэальнасці» ідзе поўным ходам. Складваецца ўражанне, што асноўныя макраэканамічныя паказчыкі на 2010 год разлічваліся, сыходзячы не з эканамічнай рэальнасці, а з задачы па забеспячэнню «святой лічбы». Пры гэтым ніхто ва ўрадзе не запярэчыў і не падаў у адстаўку. Наадварот, усе дружна казырнулі і загаласілі: «Ах, 500 долараў, ах, 500 долараў!»

З часоў добраахвотнай адстаўкі ў 1996 годзе прэм'ер-міністра Міхаіла Чыгіра і міністра Аляксандра Саснова я і не ўзгадаю, каб хтосьці з чальцоў урада выказаў падобнай выявай сваю нязгоду з афіцыйнай лініяй. Ці то кішка тонкая, ці то лінія стала настолькі выразнай?

Пераход ад кіравання ростам дабрабыту ў рэжым антыкрызіснага кіравання для беларускай Улады стаў невыканальнай задачай. Паводле яе ўяўленняў, сусветны крызіс ужо завяршыўся, і з хвіліны на хвіліну краіны свету стануць у чаргу па беларускія тавары. У гэтым і заключаецца, на мой погляд, асноўны вынік 2009 года.

А што да «святой лічбы», то я не здзіўлюся, калі да канца года яна будзе дасягнутая. Пытанне ў кошце. Колькі ўсім нам давядзецца заплаціць, каб дзяржава атрымала магчымасць плаціць нам па 500 долараў? У 2001 годзе для дасягнення аналагу «святой лічбы» давялося ў тэрміновым парадку скарачаць жыллёва будаўніцтва і іншыя інвестыцыйныя праекты. Але пра сусветны крызіс тады гаворкі не было.

ВЫНІКІ І ПРАГНОЗЫ

# САЦЫЯЛЬНЫ КАНТРАКТ ДОЙДЗЕ І ДА БЕСПРАЦОЎНЫХ

Вольга ХВОІН

**Адным — бізун за палітычныя акцыі, другім — сацыяльны пернік у выглядзе тых ці іншых эканамічных прэферэнцый. І тое, і другое — праяўленні палітыкі ўладаў на падтрыманне свайго аўтарытэта напярэдадні выбараў ва ўмовах эканамічнага крызісу. Іншая справа, наколькі абгрунтаваная і рэалістычная гэта палітыка.**

Тэмп росту вытворчасці прамысловай прадукцыі ў Беларусі ў 2009 годзе склаў 97,2 працэнта да 2008 года. Такія вынікі працы эканомікі Беларусі за мінулы год агучыў прэм’ер-міністр Сяргей Сідорскі кіраўніку краіны Аляксандру Лукашэнку. Урад рыхтуецца да «захавання высокіх тэмпаў эканамічнага развіцця» краіны і паралельна прымае меры па павелічэнню колькасці месцаў часовых падпрацовак для тых, хто акажацца ва ўмовах няпоўнай занятасці ці ўвогуле без пастаяннага месца працы.




Па выніках 2009 года тэмп прыросту валавога ўнутранага прадукту склаў 0,2 працэнта. Паводле справаздачы прэм’ер-міністра, «урад вырашыў усе пытанні з улікам дзеяння антыкрызіснай праграмы, цалкам апраўдала сябе прынятая сістэма мер, і ўзровень ВУП выйшаў на паказчыкі дакрызіснага года». Афіцыйная статыстыка гаворыць, што найлепш спрацавала перапрацоўчая галіна, прадпрыемствы «Белнафтахіма» і «Белдзяржхарчпрама». Прадпрыемствы Міністэрства прамысловасці дасягнулі толькі 77,3 працэнта ад узроўню 2008 года. У параўнанні з 2008 годам моцна пагоршылася сітуацыя з экспартам: летась быў дасягнуты толькі ўзровень 60 працэнтаў.

У афіцыйных паведамленнях, дзе на першым плане цытуюцца паказчыкі з плюсам, гаворыцца, што на 2010 год першаснай задачай ставіцца «захаванне высокіх тэмпаў эканамічнага развіцця». Аднак нагадаю, што бюджэт на 2010 год быў прыняты з дэфіцытам у памеры 2,7 трыльёна рублёў. Даходы рэспубліканскага бюджэту сёлета прадугледжаныя ў суме 35,5 трыльёна рублёў. Такое планаванне паказвае, што насамрэч урад рыхтуецца не да «высокіх тэмпаў развіцця», а да іх скарачэння.

Аднак праблемы з дэфіцытам сродкаў не пазбаўляюць улады абавязку выконваць сацыяльны кантракт, пра які перыядычна ўзгадваюць эксперты, асабліва ў час выбарчых кампаній. У новы, папярэдні прэзідэнцкім выбарам год дзяржава ўступіла з клопатам пра беспрацоўных. Для даведкі, афіцыйны ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя на 1 студзеня 2010 года склаў 1,2 працэнта. Сярэдні памер дапамогі па беспрацоўі — 42 тысячы рублёў (14,6 долара ЗША). Кошты на прадукты харчавання і аплату камунальных паслуг ведаюць усе. За гэтыя грошы можна набыць прыкладна 14 пакункаў малака і столькі ж боханаў хлеба. Астатняе беспрацоўным не прадугледжана.

Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціна Каралёва паведаміла журналістам, што сёлета плануецца прывязаць памер дапамогі ў працэнтных суадносінах да бюджэту пражыткавага мінімуму (БПМ). Велічыню гэтага працэнта чыноўніца не назвала, але падкрэсліла, што «гэта не павінна быць сума, якая б не стымулявала беспрацоўнага да пошуку працы». Сыходзячы з гэтых слоў, можна прагназаваць, што дапамогу падымуць роўна на столькі, каб можна было адрапартаваць пра сацыяльны клопат дзяржавы, але не настолькі, каб страта працы перастала пагражаць жыхарам краіны галечай. Для параўнання, памер дапамогі па беспрацоўі ў суседняй Літве складае ад 350 літаў (каля 100 еўра) да 1 041 літа (каля 300 еўра). Сума вылічваецца для кожнага індывідуальна ў залежнасці ад стажу працы і памеру папярэдніх заробкаў. У Польшчы, калі страціш працу, можна разлічваць у сярэднім на 140 еўра штомесяц. «Вілка» дапаможных выплат: 440 злотых (111 еўра) — 690 злотых (166 еўра).

Рыхтуючыся да павелічэння колькасці людзей, якія працуюць у няпоўным працоўным рэжыме, кіраўніцтва Беларусі выдзеліла на рэалізацыю праграм занятасці насельніцтва на 2010 год 154 мільярдаў рублёў (без уліку ўласных сродкаў наймальнікаў). Павялічваць колькасць працоўных месцаў плануецца і за кошт арганізацыі аплачваемых грамадскіх прац, у тым ліку для грамадзян, якія знаходзяцца ў змушаных адпачынках па ініцыятыве наймальнікаў без захавання заработнай платы. Колькасць тых, каму могуць адправіць месці вуліцу ці перабіраць бульбу, павялічаная да 90,5 тысячы чалавек, у тым ліку для беспрацоўных — да 49,2 тысячы чалавек.

З улікам усіх мераў прагнозны паказчык па ўзроўні беспрацоўя да канца 2010 года павінен скласці 1,2–1,5 працэнта. Масавых звальненняў у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны сёлета не абяцаюць, як і залатых гор.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# БЕЛ-ЧЫРВОНА-БЕЛАЕ «ХУЛІГАНСТВА»

Вольга ХВОІН

**Сонна-марозны ход калядных святаў разварушыла здарэнне ў Віцебску. На цэнтральнай 40-метровай святочнай ёлцы залунаў бел-чырвона-белы сцяг. Пра гэтую падзею не напісалі ў дзяржаўных газетах і не паказалі па ТБ. Калі быць шчырымі, то для большасці беларусаў яна нічога і не значыць. Аднак для шэрагу людзей, светапогляд якіх грунтуецца на нацыянальных каштоўнасцях, гэта было маленькім падарункам, знакам, што хоць ты і ў меншасці цяпер, але не самотны. Сцяг супрацоўнікі міліцыі знялі, але гісторыя займела працяг.**




Па падазрэнні за вывешванне сцягу быў затрыманы 35-гадовы сябра КХП — БНФ Сяргей Каваленка. Яго змясцілі ў следчы ізалятар на 2 месяцы, завялі крымінальную справу па артыкуле 339 частка 2 (хуліганства, здзейсненае паўторна, або групай асоб, або звязанае з супраціўам асобе, якой спыняліся хуліганскія дзеянні, або спалучанае з прычыненнем менш цяжкага цялеснага пашкоджання). Максімальнае пакаранне — да шасці гадоў зняволення.

У кватэры Каваленкі міліцыянты правялі ператрус і канфіскавалі ўлёткі апазіцыйнага зместу. Бел-чырвона-белых сцягоў не знайшлі. Інфармацыя пра падзеі вельмі хутка разышлася па інфармацыйных рэсурсах у інтэрнэце. І тут праявілася дастаткова рэдкая для Беларусі з’ява — салідарнасць. У абарону Сяргея Каваленкі выступілі юрысты з ПЦ «Вясна», заявіўшы, што дадзены выпадак нельга кваліфікаваць як хуліганства: «У крымінальным заканадаўстве «хуліганства» вызначаецца як «наўмысныя дзеянні, якія па-грубіянску парушаюць грамадскі парадак і дэманструюць відавочную непавагу да грамадства». Для азначэння складу хуліганства патрабуецца, каб дзеянні чалавека суправаджаліся вызначанымі акалічнасцямі. Такіх акалічнасцяў тры: гвалт або пагроза ўжывання гвалту, знішчэнне або псаванне чужой маёмасці, праява выключнага цынізму».

«Відавочна, што ў дзеяннях Сяргея Каваленкі першыя дзве акалічнасці адсутнічаюць, — патлумачыў праваабаронца Валянцін Стэфановіч. — Застаецца толькі «выключны цынізм», які адносіцца да ацэначнай катэгорыі. Гэту ацэнку дае следства, а потым і суд. Але наогул вывешванне бела-чырвона-белага нацыянальнага сцяга — гэта палітычнае дзеянне, а не дзеянне, накіраванае на парушэнне грамадскага парадку, і ні ў якім разе не з’яўляецца праявай цынізму, пагарды да грамадства».

Пасля да патрабаванняў вызваліць актывіста далучыліся партыя КХП — БНФ, Рух «За свабоду», аргкамітэт па стварэнню Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. У панядзелак у Віцебску адбыўся сход па стварэнні грамадскага камітэта ў абарону арыштаванага. Аднак найбольш у распаўсюдзе інфармацыі сваю ролю сыгралі менавіта інтэрнэт-рэсурсы, тым самым мабілізаваўшы неабыякавых людзей да салідарнасці і падтрымкі актывіста. У выніку вечарам 12 студзеня Сяргея выпусцілі з СІЗА пад падпіску аб нявыездзе. Сяргей свой учынак назваў справай гонару і палітычнай акцыяй.

Першым навіну пра сцяг паведаміў сайт «Народныя навіны Віцебска». За аператыўнасць паплаціўся рэдактар сайта Сяргей Серабро. 13 студзеня міліцыя правяла вобшук у кватэры журналіста і канфіскавала два кампутары, фотаапарат. Акрамя таго, рэдактару тэлефанавала следчая Аксана Муравіцкая, якая запрашала яго на размову адносна здымкаў бел-чырвона-белага сцяга на ёлцы. Калі нататка ў сеціве пра сцяг здольная мабілізаваць да супольных дзеянняў столькі людзей, то не дзіўна, што ўлады даўно ходзяць вакол пытання кантролю за сусветнай павуцінай. Тым больш актуальна гэта становіцца ў перыяд падрыхтоўкі да выбарчых кампаній.



Цяперашнія ўлады надзвычай балюча рэагуюць на з’яўленне нацыянальнай сімволікі, якая ў сваю чаргу для іх апанентаў ёсць сімвалам іншай, не аўтакратычнай Беларусі Лукашэнкі. Як некалі кіраўнік справамі Адміністрацыі прэзідэнта Іван Ціцянкоў пасля абвяшчэння вынікаў рэферэндуму 1995 года аб змене дзяржаўнай сімволікі з групай падтрымкі залез на дах будынка Дома ўраду ў Мінску і ўласна разарваў бел-чырвона-белы сцяг на сувеніры, так сёння сілавікі і вертыкальшчыкі з апантанасцю вылічваюць-вылоўліваюць тых, хто спрабуе вярнуць нацыянальны сімвал на яго месца.

За гэты час нацыянальныя сцягі перыядычна з’яўляюцца ў публічных месцах па ўсё Беларусі. Незарэгістраваны «Малады Фронт» перыядычна ладзіць акцыю «Горад наш!», вывешваючы сцягі на дахах дамоў, летась актывісты «Еўрапейскай Беларусі» вывесілі сто бела-чырвона-белых сцягоў уздоўж праспекта Незалежнасці ў сталіцы. І хаця паводле сацыялагічнага даследавання лабараторыі «Новак» бел-чырвона-белы сцяг лічаць сімвалам Беларусі менш за 10 працэнтаў рэспандэнтаў, для цэлага шэрагу людзей ён з’яўляецца знакам іх жыцця і дзейнасці. Таму паказальны суд над Сяргеем Каваленкам, які хутчэй за ўсё будзе мець месца, не пазбавіць улады ад бел-чырвона-белай прычыны галаўнога болю.

ВЫБАРЫ

# ПАЛІТЫКА ПАМІЖ РЭАЛІЗМАМ І ДЭКАДЭНЦТВАМ

**Выбары ў мясцовыя саветы дэпутатаў пройдуць у Беларусі, хутчэй за ўсё, у красавіку. Дакладная дата галасавання пакуль не прызначаная, але ў апазіцыйным стане пакрысе пачынаецца рух, вядуцца размовы пра вылучэнне дзесяткаў і нават сотняў прадстаўнікоў ад розных палітычных партый. Традыцыйна электаральныя кампаніі такога ўзроўню праходзяць даволі спакойна, а месцамі ўвогуле незаўважна. На фоне агульнай стагнацыі грамадскай актыўнасці жаданне старшыні Цэнтрвыбаркама Лідзіі Ярмошынай бачыць выбарчы сезон «не сумным» наўрад ці здзейсніцца. Тым больш, што за папярэднія пятнаццаць год рабілася ўсё магчымае, каб атрымаць менавіта такі вынік.**

**Але ёсць асобы, здольныя «расквяціць» выбарчую кампанію, хаця ўлады і не рады бачыць іх прозвішчы ў спісе кандыдатаў у дэпутаты. Кіраўнік барысаўскай філіі партыі БНФ Сяргей Салаш пасля правядзення шэрагу выбарчых кампаній мае досвед як народнай падтрымкі, так і нелюбові мясцовых чыноўнікаў. Эйфарыі ці расчараванняў чакаць кандыдатам, якія ўпершыню адважацца ступіць на слізкую сцежку беларускай палітыкі, Сяргей Салаш расказвае журналісту «НЧ» Вользе Хвоін.**






— Рашэнне пра ўдзел у выбарчай кампаніі ў мясцовыя саветы я ўжо прыняў. Няма куды дзецца з падводнай лодкі. Я настроіўся, ведаю, што трэба рабіць, маю ўпэўненасць — нешта атрымаецца. Хаця і не факт, што стану дэпутатам. Гэта ёсць асноўнай мэтай кампаніі, але не самамэтай. Калі гэтага не адбудзецца, Зямля не сыдзе з арбіты, маё жыццё не палепшыцца і не пагоршыцца. Будзе так, як ёсць. Калі ацэньваць агульнаапазіцыйны, дэмакратычны патэнцыял, з кожнымі выбарамі ён усё больш змяншаецца, усё менш ахвотных выходзіць на сур'ёзную працу і барацьбу за галасы. Ды і падтрымка наша невялікая. Я б сказаў так: «за прыгожыя вочы» галасуюць, за нашы ідэі — не. Калі ты не зусім адарваны ад народа, то за цябе могуць прагаласаваць. Я баюся, што частка тых, хто пойдзе на гэтыя выбары, будуць несці адарваныя ад патрэбаў людзей ідэі. На жаль, апазіцыя ў большасці жыве ў іншых каардынатах і траекторыях. Ды і вылучацца цяпер асабліва няма каму. Веры мала не толькі ў мяне, але і ў іншых актывістаў.

***— Што ў вашым разуменні «адарваныя ідэі»?***

— Магчыма, нехта і пакрыўдзіцца, але ёсць палітычныя сілы, якія лічаць, што пытанне акультызму — вельмі важнае ў Беларусі, і яго трэба вырашаць. Разумею, што знойдуцца як прыхільнікі, так і ворагі маёй тэзы. Ні тых, ні другіх я б не хацеў тут шукаць. Людзей найперш хвалюе, як мы будзем жыць далей, якія адносіны складуцца з Расіяй, што будзе з пастаўкамі нафты і газу, стане Лукашэнка наступным прэзідэнтам ці не.

***— Ці правільна будаваць выбарчую кампанію толькі на лакальных праблемах?***

— Хутчэй за ўсё, не. Натуральна, ёсць прыклады палітыкаў, якія атрымалі мандаты, канцэнтруючыся толькі на лакальных праблемах. І іх выбарцы засталіся на тым жа ўзроўні. Думаю, што трэба спрабаваць акуратна выводзіць людзей на больш глабальныя пытанні. Я прайшоў праз выбарчыя кампаніі 2003, 2007-га гадоў, і мне падаецца, што я ведаю, чаго ад мяне чакаюць, што хочуць пачуць, якія б праблемы я дапамог ім вырашыць. Але глабальна мяне цікавіць крыху іншае, чым асвятленне дарог, пад'ездаў. Канешне, бытавое — важна, бо я жыву ў гэтым горадзе і разам з іншымі людзьмі б'ю абцасы на гэтых дарогах.

***— Дэпутат мясцовага савета карыстаецца аўтарытэтам?***

— Не.

***— Вы гаворыце, што хацелася б падняць вашых выбарцаў над лакальным узроўнем, але калі дэпутат не мае аўтарытэту, то наўрад ці можна чакаць станоўчага выніку ад працы.***

— Наша краіна са своеасаблівым развіццём. На жаль, у нас не атрымаецца, як у Сербіі, узяць уладу спачатку на мясцовым узроўні, а пасля наверсе. Пакуль ва ўладзе Лукашэнка, колькі б ні было мясцовых дэпутатаў, а многа іх быць не можа, бо няма каму вылучацца, нічога не зменіцца. Калі партыя АГП заяўляе трыста кандыдатаў, БХД заяўляе дзвесце ці трыста кандыдатаў, я дакладна ведаю, што столькі не будзе. Максімум будзе сто, з іх чалавек пяцьдзесят, якія больш-менш змогуць прадстаўляць інтарэсы людзей у мясцовых саветах.

***— Якія вашы выбарцы эканамічна актыўнага ўзросту, тыя, каму зараз 25–35 год?***

— Выбарцаў такога ўзросту ў маёй акрузе вельмі мала. Яны ці спіліся, ці з'ехалі. Тыя, хто застаўся, у большасці не ўсвядомілі сябе, не нарадзілі дзяцей, не задумаліся пра заўтрашні дзень. Насамрэч, людзей 25–35 год не так часта сустрэнеш у шматпавярховіках Барысава.

***— Да чаго варта рыхтавацца тым, хто спрабуе ўвайсці ў палітычнае жыццё краіны. Ці магчыма пазбегнуць адкрытага канфлікту з уладамі?***

— Тым, каго ўлады запісалі даўно ў «маргіналы», няма чаго баяцца. Можна правесці кампанію ціха-спакойна. Калі ты яшчэ не адарваўся ад агульнага жыцця, маеш працу ў дзяржаўнай установе, то як бы ні стараўся, праблемы ўзнікнуць. Сістэма не змянілася. Увогуле, трэба разумець, што ўсе саступкі ў бок дэмакратызацыі-лібералізацыі нічога не вартыя, калі выбарчыя камісіі будуць складзеныя з тых жа асобаў, што і раней. Зрэшты, такога сігналу можна і не чакаць, пакуль існуе Ярмошына, Лазавік, уся гэтая «каманда».

***— Дык ці вартая чаго палітычная дзейнасць у такіх умовах?***

— Вартая. Я ўсё ж такі веру, што сітуацыя ў краіне зменіцца, хаця я не прагназіст і не ведаю, калі гэта адбудзецца. Але ўсё не бессэнсоўнае. Няхай мы будзем своеасаблівым угнаеннем для будучай Беларусі. Цяпер грамадства спіць. Магчыма, мы здолеем аднойчы змяніць кантэкст. Аднойчы з'явяцца новыя лідэры, якія засунуць нас за пояс, і нават дзеля гэтага трэба нешта рабіць, а тым больш, калі мы хочам, каб нашы дзеці жылі ў адрознай ад цяперашняй краіне.

***— Кіраўніцтва мясцовай вертыкалі паважае, баіцца ці ігнаруе Сяргея Салаша?***

— Я дакладна ведаю, што вядомы. Я хачу спадзявацца, што мяне паважаюць за маю пазіцыю. Мне здаецца, што частка наменклатуры ўспрымае мяне неадэкватна, як чалавека з іншай планеты. Шмат у чым гэта мая віна, бо я доўгі час быў вельмі радыкальным. На хвалі народнай падтрымкі мне падавалася, што я магу вырашаць многія пытанні, адчыняць усе дзверы. Што тычыцца ніжэйшага звяна, то, калі гэтыя чыноўнікі ўпэўненыя, што размова нікуды далей не пойдзе, яны гатовыя ўжо не слухаць, а самі распавядаць гадзінамі. Ва ўсіх ёсць адчуванне сораму за тое, што ім даводзіцца рабіць. Я бачу, як яны змяняюцца, як цьмянеюць іх вочы, калі прыходзіць чарговая выбарчая кампанія. Мы ведаем, што, нягледзячы на ўсе нашы намаганні, выніку можа не быць. А ім даводзіцца паказваць вынік, хлусіць.

***— Табе не цесна жыць у такіх рэаліях?***

— Цеснавата... Я стараюся ў гэтым жыць максімальна выбарачна, не забываць пра сваю сям'ю, сяброў, уласныя інтарэсы. Для мяне асабіста ёсць прыклады палітыкаў, якія любяць толькі палітыку, але я не лічу іх узорам. Хаця такія, крыху звар'яцелыя, таксама патрэбныя.

***— Цягам бліжэйшых двух год у Беларусі пройдуць дзве выбарчыя кампаніі. Якія твае прагнозы?***

— Я слаба веру, што ў 2011 годзе ў нас будзе іншая краіна, не кажучы пра цяперашні. Падчас мясцовых выбараў некалькі дзесяткаў чалавек могуць стаць дэпутатамі нязначных саветаў. Усё залежыць ад таго, як будуць пабудаваныя іх кампаніі. Але гэтыя мандаты ні на што не ўплываюць. Толькі на самасцвярджэнне, на тое, што ты быццам бы можаш прэзентаваць сябе як асобу ў нейкай сістэме каардынат, што не выкінуты на ўзбочыну. Ва ўсім астатнім...

***— Маем праблемы з заяўленым лідэрствам у рэгіёнах, а што з агульнанацыянальным узроўнем?***

— Я падтрымліваю Аляксандра Мілінкевіча як адзінага кандыдата, як палітыка, які сур'ёзна абазначае сябе на апазіцыйным полі. Я хацеў бы бачыць некага іншага, але, калі гэтага «іншага» няма, то я застаюся з Мілінкевічам. Грамадства не задзейнічанае ў палітычных працэсах, таму і новым лідэрам асабліва няма сярод каго заяўляцца. Ёсць цікавыя маладыя асобы, які пачынаюць паступова сябе прэзентаваць, але што з гэтага атрымаецца — невядома. Тыя, хто цяпер займае лідэрства ў палітычных плынях, у цэлым, можа, харошыя, разумныя людзі, але свой крэдыт даверу яны вычарпалі. І самае жахлівае — яны пачынаюць смяшыць, гэта нагода задумацца, ці на сваім яны месцы.

***— Песімістычная размова ў нас атрымліваецца. Але хіба такія галоўныя высновы з вашага палітычнага досведу?***

— Выснова адна — з людзьмі трэба быць шчырым. Людзей не падманеш. Можна паспрабаваць падчас кампаніі збудаваць свой імідж так, што цябе прымуць за іншага чалавека. Але праз пэўны час усе зразумеюць, хто ты насамрэч. Часам мы самі сябе хочам падмануць, пабачыць сябе такімі, якімі не з'яўляемся. Што тычыцца каманды, то ў ёй мусіць быць абсалютны давер па ўсіх пытаннях. Людзі павінны настроіцца на тое, што пасля выбараў жыццё не заканчваецца. Усё трэба ўспрымаць як лёгкі жарт і паспрабаваць максімальна спадабацца выбарцам, то бок быць пазітыўнымі. Нягледзячы на тое, што зараз я выказваю песімістычныя думкі і прагнозы, са сваімі выбарцамі я іншы.

У 2003 годзе я адчуваў, што зрабіў вельмі многа, адчуваў вялікую падтрымку. Цяпер у мяне вельмі многа расчараванняў. Я гатовы мабілізавацца на нейкім кароткім адрэзку часу, прыкласці ўсе сілы, каб дасягнуць пастаўленай мэты. Але ў перспектыве я не бачу падстаў для зменаў. Гэта мая ўнутраная параза, з якой ніхто апроч мяне не разбярэцца.

### Даведка:

Сяргей Салаш нарадзіўся ў 1974 годзе, скончыў Жодзінскі палітэхнікум па спецыяльнасці тэхнік-тэхнолаг, пасля гістарычны факультэт БДУ. З 1998 года ўзначальвае нефармальны Барысаўскі цэнтр грамадскіх ініцыятыў «Скрыжаванне». Кіраўнік мясцовай філіі партыі БНФ. Удзельнічаў у распрацоўцы першай у Беларусі стратэгіі развіцця рэгіёну. У 2003 годзе ўдзельнічаў у выбарчай кампаніі ў мясцовыя саветы, але не быў зарэгістраваны. У 2004-м балатаваўся ў Палату прадстаўнікоў. Выбарчая камісія адмовіла ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы. У 2007 годзе балатаваўся ў абласны і мясцовы саветы. За тры дні да дня галасавання быў арыштаваны і пяць сутак правёў у следчым ізалятары часовага ўтрымання.

Жанаты, мае дачку Дамініку.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 18 студзеня, панядзелак

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.10** Nota Bene.
**09.40** Здароўе.
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.00** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**12.10** Лірычная камедыя «Не прыслешвай каханне» (Украіна).
**14.10** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Культурныя людзі.
**16.25** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.20** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** Відэафільм АТН «Алена Патупчык» цыклу «Лёгка сказаць».
**18.50, 00.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Арэна».
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50** Адмысловы рэпартаж АТН «Самба ў Салоніках».
**22.05** Прэм'ера. Меладрама «Час шчасця» (Расія - Украіна).
**00.10** Драматычны серыял «Часткі цела-5».
**01.00** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** Тэорыя неверагоднасці. «Тэлепатыя».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Рэкламная паўза».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**19.05** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** Прэм'ера. «Застацца ў жывых».
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Злачынствы стагоддзя».
**23.55** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.25** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.15** Нашы навіны.
**01.30** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.50** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.05** «Далёкія сваякі».
**15.30** «Гарачы лёд».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Я - вандроўца».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Аліса назаўжды». Расія, 2008 г.
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Гучная справа».

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Драма «Адночы ў правінцыі».
**12.25** «Пра мастацтва».
**12.50** Школа рамонту.
**13.50** Мультсерыял «Аладзін» (ЗША).
**14.15** Пазакласная гадзіна.
**14.30** Бухта капітанаў.
**15.10** Тэлебарометр.
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.20** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**17.50** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - Трактар (Чэлябінск). Прамая трансляцыя. У перапынку: Калыханка.
**21.20** Беларуская часіна.
**22.25** Альбарутэнія. «Крыжовыя паходы. Уварванне».
**22.55** Хакей. Формула гульні.
**23.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**00.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**00.45** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».

**РОССИЯ**

**07.00** Мультфільмы.
**07.10** Фільм «Моцныя духам».
**10.10** Тэлесерыял «Адночы будзе каханне».
**11.00** «Ранішняя пошта».
**11.30** Фільм «Жанаты халасцяк».
**13.00** «Першыя на Марсе. Няспетая песня Сяргея Каралёва». Дакументальны фільм.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00, 17.00** Весткі.
**14.30** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.20** Фільм «Насуперак разумнаму сэнсу». Расія, 2008 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Адночы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Гісторыя лётчыка».
**22.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.25** «Нічога асабістага».
**23.40** Навіны - Беларусь.
**23.50** «Весткі+».
**00.05** «Мой срэбны шар».

**НТВ**

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**09.05** «Следства вялі».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.50** Дэтэктыўны серыял «Мангуст».
**13.30** Серыял «Бальзакаўскі век, або ўсё мужыкі-сво...».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Пракляты рай».
**18.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Павуцінне-2».
**21.30** Вострасюжэтны серыял «Апошняе вандраванне Сіндбада».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Вочная стаўка».

**EUROSPORT**

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Дзень 1.
**10.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Дзень 1.
**15.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Дзень 1.
**17.30, 20.00** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Навіны.
**17.45** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Групавы этап. Ангола - Алжыр. Ангола.
**20.15** Тэніс. Гейм, сэт і Матч. Часопіс.
**20.40** Тэніс. Часопіс.
**20.45** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**21.15** Футбол. Кубак свету-2010. ПАР. Часопіс.
**21.45** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.25** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**23.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.30** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Групавы этап. Ангола - Алжыр. Ангола.
**01.15** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Навіны.
**01.30** Тэніс. Часопіс.
**01.35** Тэніс. Гейм, сэт і Матч. Часопіс.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 2.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** Еўропа сёння.
**17.40** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.40** Госць «Белсату».
**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.20** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.25** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** МакраФон: Канцэрт дуэту «Гурзуф».
**20.05** «ПНР дэ люкс», дак. фільм, 2007 г.
**20.25** Невядомая Беларусь: «Берасцейская крэпасць – дзве абароны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Фільматэка майстроў: «Чалавек, якога там не было», маст. фільм, 2001 г., ЗША.
**23.15** Аб'ектыў.

## 19 студзеня, аўторак

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна».
**09.05** Серыял «І усёткі я кахаю» (Расія).
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Самба ў Салоніках».
**12.10** Слова Мітрапаліта Філарэта на свята Вадохрышча Гасподня.
**12.20** Камедыя «Блазан і Венера» (Расія).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Сямейная сага «Ярмолавы» (Расія).
**16.20** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.20** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** Хранікальна-дакументальны фільм цыклу «У інтарэсах нацыянальнай бяспекі».
**18.50, 00.20** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Серыял «І усёткі я кахаю» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Прэм'ера. Рамантычная камедыя «М + Ж» (Расія).
**23.25** Драматычны серыял «Часткі цела-5».
**00.25** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.05** Максім Дунаеўскі. «Лёсу не раз шапну: «Мерсі».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**19.00** Прэм'ера. «Слова жанчыне». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Крэм». Шматсер. фільм.
**22.05** Прэм'ера. «Страчаны спакой». Шматсерыйны фільм.
**22.55** Нашы навіны.
**23.10** Навіны спорту.
**23.15** «Зваротны адлік».
**23.50** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.35** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.00** Нашы навіны.
**01.15** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Аліса назаўжды». Расія, 2008 г.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.50** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Крокі да поспеху».
**14.40** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Top Gear. Руская версія».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** «Спецкар аддзела расследаванняў». Серыял.
**22.00** «Ля парадната пад'езду».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Надзвычайныя гісторыі».
**23.50** «Рэдакцыя». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Кінаповесць «Гараджане» (СССР).
**12.00** «Запал па культуры».
**12.40** Хакей. Формула гульні.
**13.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**14.00** Кінаспробы.
**14.25** Мультфільм.
**14.45** Пазакласная гадзіна.
**15.00** Свая кампанія.
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дэтэктыў «Першая сустрэча, апошняя сустрэча» (СССР).
**20.55** Калыханка.
**21.10** Беларуская часіна.
**22.15** Альбарутэнія. «Крыжовыя паходы. Супраціў».
**22.40** Спорт-кадр.
**23.10** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.40** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».

**РОССИЯ**

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Прэм'ера. Тэлесерыял «Адночы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Формула шчасця Марыі Пахоменка». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага».
**11.40** Тэлесерыял «Гісторыя лётчыка».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**15.20** Дэтэктыўны тэлесерыял «Згон».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Адночы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Тэлесерыял «Гісторыя лётчыка».
**22.25** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі+».
**23.55** Прэм'ера. «Памяці Савы Ямшчыкова». Дакументальны фільм.

**НТВ**

**07.00, 10.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**08.55** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**09.10** «Вочная стаўка».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Кватэрнае пытанне».
**11.50** Дэтэктыўны серыял «Мангуст».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Бальзакаўскі век, або ўсё мужыкі-сво...».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Пракляты рай».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Павуцінне-2».
**21.30** Вострасюжэтны серыял «Апошняе вандраванне Сіндбада».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Вочная стаўка».

**EUROSPORT**

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Дзень 2.
**10.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Дзень 2.
**15.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Дзень 2.
**17.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**17.45** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Групавы этап. Кот-д'Івуар - Тога. Ангола.
**20.00** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Навіны.
**20.15** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.25** Тэніс. Гейм, сэт і Матч. Часопіс.
**21.00** Тэніс. Часопіс.
**21.05** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы. Пары. Кароткая праграма. Талін (Эстонія).
**23.00** Зімовыя віды спорту. Фігурнае катанне.
**23.15** Бокс.
**00.45** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. Агляд.
**01.30** Тэніс. Часопіс.
**01.35** Тэніс. Гейм, сэт і Матч. Часопіс.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Дзень 3.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.40** «Бульбаны», мультсерыял.
**17.55** Дакументальная гадзіна: «Дзе цяпер той мур?», дак. фільм, 2009 г., Германія.
**18.50** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.20** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.25** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** «Мелодыя душы», дак. фільм, 1993 г., Польшча.
**20.10** Акно ў Еўропу.
**20.40** Сальда (эканамічная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**22.15** МакраФон: «Рамантычны канцэрт» (2009): ч. 2.
**22.55** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 20 студзеня, серада

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Меладраматычны серыял «І усёткі я кахаю» (Расія).
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.35** Алімпійскі часопіс.
**12.10** Дэтэктыўны трылер «Бумеранг» (Расія).
**14.05** Альманах вандраванняў.
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха». Фільм «Францыск Скарына». Частка 1-я.
**15.55** Сямейная сага «Ярмолавы» (Расія).
**16.45** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.35** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Зямельнае пытанне».
**19.50** Меладраматычны серыял «І усёткі я кахаю» (Расія).
**20.50** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** Панарама.
**21.50** Прэм'ера. Сямейная драма «Светлячкі ў садзе» (ЗША).
**23.45** Драматычны вострасюжэтны серыял «Часткі цела-5» (ЗША).
**00.45** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**19.00** Прэм'ера. «Слова жанчыне». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Крэм». Шматсер. фільм.
**22.05** Прэм'ера. «Страчаны спакой». Шматсерыйны фільм.
**22.55** Нашы навіны.
**23.10** Навіны спорту.
**23.15** «На ноч гледзячы».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

**07.05** «Агенцтва». Камедыйны серыял.
**07.55** Фільм «Прэмія Дарвіна». ЗША, 2006 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.45** Фільм «Біндзюжнік і кароль». СССР.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40** Фільм «Паварот». ЗША-Францыя, 1997 г.
**22.55** «Прафесійны бокс».
**23.30** Драма «Атэль «Руанда». ЗША-Вялікабрытанія-Італія, 2004 г.
**01.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Дэтэктыў "Першая сустрэча, апошняя сустрэча» (СССР).
**12.10** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.55** Спорт-кадр.
**13.25** Мультфільм.
**13.40** Мультсерыял «Аладзін» (ЗША). Заключная серыя.
**14.00** Пазакласная гадзіна.
**14.15** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя).
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**17.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Хакей. КХЛ. Дынама (Масква) - Дынама (Мінск). У перапынку: Калыханка.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.30** Альбарутэнія. Тэўтонскі ордэн.
**23.00** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.30** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя).

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Семнаццаць імгненняў Яхіма Капеляна». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Гісторыя лётчыка».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**15.20** Дэтэктыўны тэлесерыял «Згон».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Тэлесерыял «Гісторыя лётчыка».
**22.25** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі+».
**23.55** Прэм'ера. «Генерал Дуглас. Перапынены палёт». Дакументальны фільм.

НТВ

**09.10** «Вочная стаўка».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Дачны адказ».
**11.50** Дэтэктыўны серыял «Мангуст».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Бальзакаўскі век, або ўсё мужыкі-сво...».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Праклятыя рай».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Павуціннe-3».
**21.25** Вострасюжэтны серыял «Апошняе вандраванне Сіндбада».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Вочная стаўка».

EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Дзень 3.
**10.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 3.
**15.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы (Італія).
**17.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Монтэ Карла. Дзень 1.
**18.00** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Групавы этап. Егіпет - Бенін. Ангола.
**20.00** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Навіны.
**20.15** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.25** Тэніс. Гейм, сэт і Матч. Часопіс.
**20.55** Тэніс. Часопіс.
**21.00** Веласпорт. "Планета Армстронг».
**21.05** Абранае па серадах.
**21.10** Конны спорт. Кубак свету. Канкур. Мехелен (Бельгія).
**22.05** Навіны коннага спорту.
**22.10** Гольф. Тур PGA. Sony Open. Ганалулу (ЗША).
**23.10** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**23.15** Яхт клуб. Навіны ветразевага спорту.
**23.20** Абранае па серадах.
**23.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы. Пары. Адвольная праграма. Талін (Эстонія).
**00.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы (Італія).
**01.30** Тэніс. Часопіс.
**01.35** Тэніс. Гейм, сэт і Матч. Часопіс.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Дзень 4.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.45** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**18.45** Чалавек і вайна: «Яны хацелі забіць Гітлера», дак. фільм, 2004 г., Германія. 3 серыя: «Замаховец».
**19.35** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.40** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.55** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Магдэбургскае права ў Беларусі».
**20.05** «Бульбаны», мультсерыял.
**20.20** Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў, 25 серыя: «Дваццаць гадоў пасля разбурэння муру».
**20.35** Без рэтушы: «Удар з-за мяжы», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Вакол свету за восемдзесят дзён», маст. фільм, 1989 г., ЗША–Югаславія. 2 серыя.
**22.50** Аб'ектыў.

## 21 студзеня, чацвер

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.05** Меладраматычны серыял «І усёткі я кахаю» (Расія).
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН «Казкі старога Горада» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Крымінальная меладрама «Чорная сукенка» (Расія - Украіна).
**14.05** Уласнай персонай.
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха». Фільм «Францыск Скарына». Частка 2-я.
**15.55** Сямейная сага «Ярмолавы» (Расія).
**16.45** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.55** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Меладраматычны серыял «І усёткі я кахаю» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.05** Біяграфічная драма «Дзённік яго жонкі» (Расія).
**00.10** Драматычны вострасюжэтны серыял «Часткі цела-5» (ЗША).
**01.00** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**19.00** Прэм'ера АНТ: «Слова жанчыне». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера . «Крэм». Шматсер. фільм.
**22.05** Прэм'ера. «Страчаны спакой». Шматсерыйны фільм.
**22.55** Нашы навіны.
**23.10** Навіны спорту.
**23.15** «На ноч гледзячы».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер.фільм.
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажалiцца».
**08.50** «Рэдакцыя». Серыял. Закл. серыі.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.50** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Спецкар аддзела расследаванняў». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** «Спецкар аддзела расследаванняў». Серыял.
**22.00** «Асабісты інтарэс».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Сакрэтныя гісторыі».
**23.50** «Пантэра». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Фантастычны баявік «Апошняя сутычка» (ЗША).
**12.15** Экспедыцыя.
**12.40** Бітва экстрасэнсаў.
**13.45** Мультфільм.
**14.00** Пазакласная гадзіна.
**14.10** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя).
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Драма «Прабач» (СССР).
**20.45** Калыханка.
**21.05** Беларуская часіна.
**22.05** Альбарутэнія. Вялікі стэп.
**22.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.10** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя).

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Пад маскай жартаўніка. Мікіта Багаслоўскі». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Гісторыя лётчыка».
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**15.20** Дэтэктыўны тэлесерыял «Згон».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Тэлесерыял «Гісторыя лётчыка».
**22.25** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі+».
**23.55** Прэм'ера. «Дэтэктар хлусні. Жэсты». Дакументальны фільм.

НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** «Першая кроў».
**08.55** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**09.10** «Вочная стаўка».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Алтар Перамогі».
**11.45** Дэтэктыўны серыял «Мангуст».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Бальзакаўскі век, або ўсё мужыкі-сво...».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Праклятыя рай».
**18.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Павуцінне-3».
**21.30** Вострасюжэтны серыял «Апошняе вандраванне Сіндбада».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Вочная стаўка».

EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Дзень 4.
**10.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Дзень 4.
**15.15** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы (Італія).
**17.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Монтэ Карла. Дзень 2.
**18.00** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Групавы этап. Камерун - Туніс. Ангола.
**20.00** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Навіны.
**20.15** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.25** Тэніс. Гейм, сэт і Матч. Часопіс.
**20.55** Тэніс. Часопіс.
**21.00** Веласпорт. "Планета Армстронг».
**21.05** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыя. HS 134 (Польшча).
**21.50** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Адвольная праграма. Талін (Эстонія).
**23.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы. Арыгінальны танец. Талін (Эстонія).
**00.45** Ралі. Ралійная серыя IRC. Монтэ Карла. Дзень 2.
**01.15** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Навіны.
**01.30** Тэніс. Часопіс.
**01.35** Тэніс. Гейм, сэт і Матч. Часопіс.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Дзень 5.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** Праект «Будучыня».
**17.40** «Вакол свету за восемдзесят дзён», маст. фільм, 1989 г., ЗША–Югаславія. 2 серыя.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** «Адэскія матывы», дак. фільм, 2008 г.
**20.10** Форум: «Вылечыць медыцыну».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял: 3 серыя.
**22.05** Без рэтушы: «Удар з-за мяжы», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**22.35** Аб'ектыў.

## 22 СТУДЗЕНЯ, ПЯТНІЦА

### Першы канал

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Меладраматычны серыял «І усёткі я кахаю» (Расія).
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві» (Расія-Украіна).
**10.50** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Дэтэктыў «Галоўны доказ» (Расія).
**14.05** Шпілька.
**14.30** Відэафільм АТН «Таямніцы букініста».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха». Фільм «Францыск Скарына». Частка 3-я.
**15.55** Сямейная сага «Ярмолавы» (Расія).
**16.45** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.55** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Меладраматычны серыял «І усёткі я кахаю» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Фільм-катастрофа «Армагедон» (ЗША).
**00.40** Драматычны вострасюжэтны серыял «Часткі цела-5» (ЗША).
**01.25** Дзень спорту.

### АНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсерыйны фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Фільме «Начны дазор».
**23.15** Наша «Белараша».
**23.50** Трылер «Альфа Дог».
**01.50** Нашы навіны.
**02.05** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Пантэра». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.50** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.40** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Спецкар аддзела расследаванняў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтарэс».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Прэмія Дарвіна». ЗША, 2006 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.15** Фільм «Плакальшчык або навагодні дэтэктыў». Расія, 2004г.
**01.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.00** У гэты дзень.
**09.05** Жансавет.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Драма «Прабач» (СССР).
**12.00** Гаспадар.
**12.30** Жывы гук.
**13.10** Медычныя таямніцы.
**13.40** Мультфільм.
**13.50** Свая музыка. Працяг.
**14.20** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя).
**15.10** Біятлон. Кубак свету.Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**16.35** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Пра мастацтва.
**19.30** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**20.20** Калыханка.
**20.45** Бітва экстрасэнсаў.
**21.50** Прэм'ера. «Небяспечны госць ля ног каралевы». Дакументальны фільм (Расія).
**22.40** Тэлепорт.
**23.05** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Юнасць (Мінск) - Металург (Жлобін).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Гісторыя лётчыка». Расія, 2009 г.
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** Пакой смеху.
**15.15** Дэтэктыўны тэлесерыял «Згон».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Вострасюжэтны фільм «Гарачы лістапад».
**22.25** Навіны - Беларусь.
**22.35** Фільм «Рассмяшыць бога».
**00.20** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.25** «Масква-Ялта-транзіт».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.50** «Крамлёўская кухня».
**11.45** Дэтэктыўны серыял «Мангуст».
**12.40** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Бальзакаўскі век, або ўсё мужыкі-сво...».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Пракляты рай».
**18.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**20.55** Прэм'ера. Вострасюжэтны дэтэктыў «Падводныя камяні».
**22.45** Крымінальная драма «Прызнанні небяспечнага чалавека».
**00.45** Рамантычная камедыя «Без аглядкі».

### EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 5.
**10.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 5.
**15.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт. Антхольц (Італія).
**16.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Супер-гігант. Кіцбюэль (Аўстрыя).
**17.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 134. Закапанэ (Польшча).
**19.00** Тэніс. Гейм, сэт і Матч. Часопіс.
**19.30** Тэніс. Часопіс.
**19.35** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Навіны.
**19.50** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Монтэ Карла. Дзень 3.
**21.45** Веласпорт. «Планета Армстронг».
**21.50** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы. Адвольны танец. Талін (Эстонія).
**00.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Монтэ Карла. Дзень 3.
**01.45** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 5.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 6.

### БЕЛСАТ tv

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.40** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.20** Форум (ток-шоў): «Вылечыць медыцыну».
**19.10** Хто ёсць кім: Генадзь Бураўкін.
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.45** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Крымская крыніца», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**20.35** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Гаспадыня зёлак», маст. фільм, 2005 г., Вялікая Брытанія.
**22.55** Аб'ектыў.

## 23 СТУДЗЕНЯ, СУБОТА

### Першы канал

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05** Зона Х.
**07.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.30, 08.25, 14.55** Дзелавое жыццё.
**08.10** Зона Х.
**08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.30** Існасць.
**09.05** Здароўе.
**09.35** Дэтэктыўны серыял «Шпікі раённага маштабу» (Расія).
**10.25** Шпілька.
**10.55** Ранішняя хваля.
**11.30** «OFF STAGE LIFE».
**11.45** Алімпійскі часопіс.
**12.10** Кінааповесць «Калі дрэвы былі вялікімі» (СССР).
**14.05** Прэм'ера. Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**14.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Вакол планеты.
**16.10** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**17.10** Відэафільм АТН «Іванаўская купель» цыклу «Зямля беларуская».
**17.25** Відэафільм АТН «Галіна Арлова» цыклу «Лёгка сказаць».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.30** «На біс!» Канцэртная праграма Ф.Кіркорава.
**21.00** Панарама.
**21.40** Фільм тыдня. Трылер «Адрачэнцы» (ЗША).
**00.20** Уласны персонай.

### АНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** Суботні «Ералаш».
**11.35** «Мой радавод».
**12.25** АНТ прадстаўляе: Тэлечасопіс «Саюз».
**12.55** «Кінаметры вайны». «Малюем кіно. Дняпроўская мяжа».
**13.25** «Дняпроўская мяжа». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Тэорыя неверагоднасці. «Гіпноз».
**16.55** Фільм «Руд і Сэм».
**18.55** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**19.55** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Гістарычная меладрама «Коко Шанэль». Францыя-Вялікабрытанія-Італія, 2008 год.
**00.50** Легенды «Рэтра FM».

### СТВ

**06.10** «Анфас».
**06.25** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.20** Фільм «Андрэй і злы чарадзей». СССР, 1981г.
**09.30** «Культурнае жыццё».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.50** Фільм «Набожная Марта». СССР, 1980г.
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.20** «Пяць гісторый».
**17.50** Фільм «Здзіві мяне». Украіна, 2008г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Раш». ЗША, 2007г.
**23.30** Фільм «Мяне тут няма». Германія-ЗША, 2007 г.
**01.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.50** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Усё аб бяспецы.
**08.45** Тэлепорт.
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Нашы тэсты.
**09.50** «Небяспечны госць ля ног каралевы». Дакументальны фільм (Расія).
**10.35** Жансавет.
**11.15** Свая кампанія.
**12.00** Лабірынты: стыгматы.
**12.30** «Запал па культуры».
**13.10** Камедыйная меладрама «Коткі-мышкі» (Францыя).
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.40** Рамантычная камедыя «Месяцовы тата» (Расія-Японія- Германія).
**18.50** «Зоркі гумару». Гумарыстычная праграма (Расія).
**20.40** Камедыйная меладрама «Дзяўчынка мая» (Расія-Украіна)
**22.30** Жывы гук.
**23.10** Казанова.
**23.40** Дэтэктыўны трылер «Імперыя ваўкоў» (Францыя).

### РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.10** «Здабытак рэспублікі».
**07.25** «Падарожжы музыкі».
**07.55** Фільм «Гамлет».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** «Хто ў хаце гаспадар».
**12.20** Фільм «Рассмяшыць бога».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Гарадок». Дайджэст.
**14.45** «Перапыненае маўчанне. Муслім Магамаеў». Дакументальны фільм.
**15.40** Прэм'ера. «Вялікая сям'я. Чайкоўскія».
**17.30** «Суботні вечар».
**19.00** Весткі.
**19.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**20.15** Тэлефільм «Сашка, каханне маё». Расія, 2007 г.
**23.25** Камедыя «Ванька Грозны». Расія, 2008 г.
**01.05** Вострасюжэтны фільм «Гарачы лістапад».
**02.40** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.10** Вострасюжэтны дэтэктыў «Падводныя камяні».
**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Жаночы погляд».
**09.00** «Агляд».
**09.30** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Алтар Перамогі». Севастопаль.
**14.15** Камедыйны баявік «Васабі».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. Крымінальная меладрама «Шлюбны кантракт».
**18.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.05** «Праграма Максімум».
**21.10** «Рускія сенсацыі».
**22.05** «Ты не паверыш!».
**23.00** Прэм'ера. Маладзевы баявік «Ніколі не здавайся».
**01.00** Камедыя «Забі мяне! Ну, калі ласка».

### EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 6.
**10.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 6.
**12.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Хуткасны спуск. Кіцбюэль (Аўстрыя).
**13.45** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 6.
**15.15** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Спрынт. Антхольц (Італія).
**16.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 134. Закапанэ (Польшча).
**18.40** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**18.45** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Навіны.
**19.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 6.
**20.30** Тэніс. Гейм, сэт і Матч. Часопіс.
**20.55** Тэніс. Часопіс.
**21.00** Веласпорт. «Планета Армстронг».
**21.05** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Адвольная праграма. Талін (Эстонія).
**22.30** Бокс.
**00.30** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 6.
**01.30** Тэніс. Часопіс.
**01.35** Тэніс. Гейм, сэт і Матч. Часопіс.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 7.

### БЕЛСАТ tv

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.40** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**18.10** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**18.35** Чалавек і вайна: «Яны хацелі забіць Гітлера», дак. фільм, 2004 г., Германія; 4 серыя: «Апошні шанец».
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** «Фокусная адлегласць», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**19.05** Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў, 26 серыя: «Унія і суседзі».
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Суботні сеанс: «Таксі-4», маст. фільм, 2007 г., ЗША.
**22.50** Аб'ектыў.

## 24 СТУДЗЕНЯ, НЯДЗЕЛА

**Першы канал**

**07.40** Анімацыйны прыгодніцкі фільм «Дыназаўр» (ЗША).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал». Праграма аб войску.
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.20** Культурныя людзі.
**10.55** У свеце матораў.
**11.30** Nota Bene.
**12.10** Драма «Мой ласкавы і пяшчотны звер» (СССР).
**14.15** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**14.40** «OFF STAGE LIFE».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**16.15** Рамантычная фантазія «Несмяротныя» (ЗША).
**18.00** Суперлато.
**19.15** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.10** Прэм'ера. Камедыйная драма «Нью-Йорк, Нью-Йорк» (ЗША).

**АНТ**

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная прапаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** «Песні Перамогі». «Каралі і Блазны».
**13.35** Нядзельны «Ералаш».
**14.10** Фільм «Розыгрыш».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. Меладрама «Ледзяны запал». Расія, 2007 год.
**18.20** Да дня нараджэння Уладзіміра Высоцкага. «Свая каляіна».
**20.00** Контуры.
**21.05** Рамантычная камедыя «Новы хлопец маёй мамы».
**22.55** Драма «Казанова».

**СТВ**

**07.05** «Агенцтва». Камедыйны серыял.
**07.55** «Навагодния прыгоды». Тэлефільм.
**09.35** «Аўтапанарама».
**10.05** «Вялікі сняданак».
**10.45** Фільм «Мушкецёры дваццаць гадоў пасля». Расія, 1992г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Чужы квіток». ЗША, 2000г.
**22.40** Фільм «Дрэнны Санта». Германія-ЗША, 2003г.
**00.15** СТВ прадстаўляе: Юбілейны канцэрт групы «Нейра Дзюбель».
**02.00** «Салдаты. Новы год, твая дывізія!».

**ЛАД**

**06.55** Дабравест.
**07.20** Мір вашай хаце.
**07.30** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.00** Рамантычная камедыя «Месяцовы тата» (Расія-Японія- Германія).
**10.00** Школа рамонту.
**11.00** Медычныя таямніцы.
**11.45** Кінаспробы.
**12.05** Бухта капітанаў.
**12.45** «Казка аб цару Салтане». Мультфільм (СССР).
**13.40** «Правы чалавека».
**13.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Жанчыны Прамая трансляцыя.
**14.40** Музычная камедыя «Не хадзіце, дзеўкі, замуж» (СССР).
**15.55** Хакей. КХЛ. Поўначсталь (Чарапавец) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**18.20** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Мужчыны.
**19.15** Нашы тэсты.
**19.45** Экспедыцыя.
**20.20** Тэлебарометр.
**20.40** Меладрама «Цудаў не бывае» (Расія).



**22.40** Свая музыка. Працяг.
**23.10** Прасоўванне+.

**РОССИЯ**

**07.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**07.30** Мультфільм.
**07.50** Тэлефільм «Сашка, каханне маё». Расія, 2007 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.20** Фільм «Вас выклікае Таймыр».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.50** «Аб сабе...». Вечар Святланы Davkuchko вай.
**16.00** Фільм «Дзень вяселля прыйдзецца ўдакладніць».
**17.50** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова.
**20.40** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2010.
**23.40** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.40** Вострасюжэтны фільм «Помста».
**02.25** Заканчэнне эфіру.

**НТВ**

**06.20** Камедыйны баявік «Васабі».
**07.50** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Вочная стаўка».
**11.15** «Асабліва небяспечны!».
**11.55** «Дачны адказ.
**13.00** Сёння.
**13.20** «Крамлёўская кухня». Сакрэтная сувязь.
**14.10** Меладрама «Пераможца».
**16.00** Сёння.
**16.15** Прэм'ера. Крымінальная меладрама «Шлюбны кантракт».
**18.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Вынiковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** Дэтэктыў «Версія».
**00.10** «Асабліва небяспечны!».

**EUROSPORT**

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 7.
**10.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 7.
**15.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам. Кіцбюэль (Аўстрыя). Спроба 2.
**15.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Антхольц (Італія).
**16.15** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу. Антхольц (Італія).
**17.00** Лыжнае дваяборства. Кубак свету. Гонка па сістэме Гундэрсена. Шонах (Германія).
**17.25** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**17.30** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Навіны.
**17.45** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Групавы этап. Ангола. 1/4 фіналу.
**20.00** Тэніс. Гейм, сэт і Матч. Часопіс.
**20.25** Тэніс. Часопіс.
**20.30** Веласпорт. «Планета Армстронг».
**20.35** Футбол. Еўрагалы. Браты Туры. Часопіс.
**20.50** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Групавы этап. Камерун - Туніс. Ангола.
**21.15** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Групавы этап. Ангола. 1/4 фіналу.
**23.30** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Навіны.
**23.45** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы. Паказальны выступ. Талін (Эстонія).
**01.25** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**01.30** Тэніс. Часопіс.
**01.35** Тэніс. Гейм, сэт і Матч. Часопіс.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Мельбурн (Аўстралія). Дзень 8.

**БЕЛСАТ tv**

**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.20** Дакументальная гадзіна: «Журналісты», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**19.15** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.20** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** МакраФон: «Троіца», фільм-канцэрт.
**20.25** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.30** Фільматэка майстроў: «Прыватныя жыцці», драма, 2001 г., Іспанія.

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012211080010 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926
г. Минск, ул. Коллекторная, 11

КУДА ______
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______
Время приема ______ ч. ______ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |

Плательщик

Пеня ______
Всего ______

Кассир

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА

# ЭРА ЭКСТРАСЭНСАЎ

Іван БІЧ

**20 гадоў таму ў СССР пачалася эпоха экстрасэнсаў: па цэнтральных тэлеканалах пачалі дэманстраваць сеансы масавага лекавання Анатоля Кашпіроўскага і Алана Чумака.**






Здавалася б, поўная антынавуковая лухта, аднак у той час поспех такіх практык быў фантастычны. 57 працэнтаў тэлеаўдыторыі, калі верыць апытанням, збіраліся кожны тыдзень каля экранаў, каб пабачыць славутага доктара Кашпіроўскага і атрымаць ад яго пазітыўны сігнал.

Анатоль Кашпіроўскі нарадзіўся ў 1939 годзе ва ўкраінскім Праскураве. Пасля заканчэння Вінніцкага медыцынскага інстытута і 25-гадовай псіхіятрычнай практыкі, ён нейкім чынам уладкаваўся псіхатэрапеўтам у зборную СССР па цяжкай атлетыцы. Злыя языкі кажуць, што ў гэты час вакол яго сфармаваўся клуб прыхільніц, які складаўся ў асноўным з жонак партыйнай эліты. Быццам менавіта яны зрабілі ўсё, каб Кашпіроўскі атрымаў карт-бланш. У 1989 годзе доктар правёў два сеансы тэлевізійнай анестэзіі. Пасля гэтага яму далі вячэрні эфір на Першым канале.

Нягледзячы на тое, што хутка сеансы Кашпіроўскага знялі з сеткі праграм, той працягваў стрыгчы купоны. У 1993 годзе яго абралі дэпутатам Дзяржаўнай думы ад Яраслаўскай вобласці па спісу ліберал-дэмакратаў. У 1995-м, пасля таго, як Басаеў захапіў радзільны дом у Будзёнаўску, Кашпіроўскі збіраўся з дапамогай гіпнозу нейтралізаваць тэрарыстаў.

У той жа год Анатоль пайшоў з вялікай палітыкі. Цяпер Кашпіроўскі час ад часу з'яўляецца на старонках медыя хутчэй з экзатычных і скандальных нагодаў. Так, у 2006 годзе яго спрабавалі арыштаваць у Чэлябінску за заняцце нетрадыцыйнай медыцынай. У адказ Кашпіроўскі пагразіў міліцыянерам, якія мелі намер надзець на яго кайданкі, адмоўнымі працэсам у іхнім арганізме.

Куды больш праблем, чым міліцыянеры, Кашпіроўскаму дастаўляў і дастаўляе канкурэнт у асобе Алана Чумака. Былы выпускнік Інстытута фізічнай культуры і факультэта журналістыкі МГУ праславіўся тым, што падчас сеансаў на ТБ зараджаў розныя субстанцыі — ваду, крэмы, мазі і нават глядачоў. Пры гэтым, у адрозненні ад Кашпіроўскага, падчас сеансаў Чумак не казаў ні слова — проста рабіў рухі і варушыў вуснамі. Адсутнасць слоў падчас сеансу Чумак выдаваў за вялікі прарыў.

У адным з інтэрв'ю ён заявіў, што яго навучалі галасы, якія працавалі дыктарамі ў яго галаве пазменна. У час гэтых лекцый Чумак быццам занатоўваў усё, што яму дыктавалі. Па тых канспектах Алан пасля і навучаўся.

Самай арыгінальнай выхадкай Чумака стала гісторыя з выпускам газеты "Вечерняя Москва". Напрыканцы лета 1989 года ў сродках масавай інфармацыі з'явілася сенсацыйнае паведамленне пра тое, што 1 верасня 1989 года нумар вячоркі будзе "зараджаны" Аланам Чумаком. У дзень распаўсюду газеты (а таксама праз некаторы час) у сталіцы ўзнікалі вялікія чэргі каля газетных шапікаў і аўтаматаў. Спекулянты перапрадавалі экземпляры газеты ў некалькі разоў даражэй. Асобныя людзі для ўзмацнення тэрапеўтычнага эфекту сталі літаральна есці кавалачкі газеты. Прычым некаторым, нібыта, гэта моцна дапамагала. Як кажуць, без каментара.

Наступным следствам дуэлі Чумак супраць Кашпіроўскага стаў падзел у працоўных калектывах і сем'ях. Адны сцвярджалі, што Кашпіроўскі больш моцны за Чумака. Іншыя — наадварот.

Відавочна, што перамог у тым спаборніцтве Кашпіроўскі. Чумак не змог зрабіць палітычнай кар'еры. На выбарах у Дзяржаўную думу па Самарскай вобласці ён набраў толькі тры працэнты галасоў выбаршчыкаў. Праўда, гэта не замінае яму і дасюль практыкаваць. Ён зараджае пазітывам усё, што толькі можна, уключаючы відэакасеты і нават шампунь.

Пры гэтым Чумак вельмі не любіць Кашпіроўскага, называючы яго шарлатанам. Ён сцвярджае, што ў выніку сеансаў Кашпіроўскага людзі траплялі ў псіхушкі. Па яго словах, двойчы ўлады СССР прасілі Анатоля падчас перапынкаў футбольных матчаў з удзелам савецкай зборнай зняць у аўдыторыі стрэс. Кашпіроўскі намагаўся, аднак нічога ў яго не атрымалася.

Аднак і без законаў пра забарону экстрасэнсаў давер да Чумака і Кашпіроўскага падае. Адпаведна апытанням, ад 60 да 79 працэнтаў расіян прызналі, што ТБ тэрапія не мае ўплыву на здароўе. Больш таго, многія людзі лічаць, што кашпіроўшчына і чумакоўшчына дрэнна ўплываюць на здароўе. Засталіся прыкладна 5 працэнтаў фанатаў такога метаду лячэння. У сеціве можна сустрэць іхнія панегірыкі на адрас Кашпіроўскага. Напрыклад, такога кшталту: «*Пусть враги изнывают от злости, / Но ведь тысячи верных друзей, / Умоляя зовут тебя в гости / Побывать хоть на несколько дней*».

Застаецца загадкай, чаму на той час яшчэ дастаткова моцны КПСС выпусціў у прайм-тайм ранішняга і вячэрняга эфіру такіх супярэчлівых персанажаў. Нямецкі «Freitag» сур'ёзна сцвярджае, што гэта была адна з апошніх спроб камуністаў неяк адвесці ўвагу грамадзян ад праблем сістэмы і выйграць час. Калі гэта так, калі сапраўды стаўка рабілася на экстрасэнсаў, то СССР насамрэч быў асуджаны.



Анатоль Кашпіроўскі



Алан Чумак

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Пуцін не адмовіўся ад сваёй мары аднавіць кантроль Масквы над краінамі былога СССР… У большасці выпадкаў падобная тактыка мела вынікі, якія былі не на карысць Масквы. Не толькі Беларусь, але і такія краіны, як Азербайджан, Арменія і нават Туркменістан, спяшаюцца пасябраваць з Захадам ці Кітаем. Са свайго боку, заходнееўрапейскія краіны, якія залежаць ад расійскіх паставак энергарэсурсаў, атрымалі свой штогадовы зімовы «трывожны званок». Трыццаць пяць працэнтаў нафтавага імпарту Германіі паступае па беларускім трубаправодзе.

**«The Washington Post» (ЗША)**

Пытанне гандлю — на якія саступкі гатовая пайсці Расія, каб утрымліваць Лукашэнку ў сферы свайго ўплыву, і, у сваю чаргу, наколькі апетыты Бацькі вялікія? Аляксандр Рыгоравіч у апошні час спрабуе гуляць у нейкую расцяжку — то ён раптам кідаецца ў абдымкі да Еўрасаюзу, то зноў да Расіі. Таму, натуральна, любыя эканамічныя саступкі яму выклікаюць вялікія пытанні. Уся стратэгія Лукашэнкі зводзіцца да балансавання паміж рознымі цэнтрамі сілы.

**BBC (Вялікабрытанія)**

Гэтым разам Бацька Лукашэнка відавочна пралічыўся. Энергетычны шантаж не зрабіў належнага ўплыву на Маскву, а генеральны дырэктар ААТ «Янтарьэнерго» Міхаіл Цікель у той жа дзень заявіў: «Калінінградская вобласць не будзе мець праблем з энергазабеспячэннем, нават калі Беларусь сапраўды спыніць пастаўкі расійскай электраэнергіі»… Відавочна, што рана ці позна Беларусі давядзецца ісці на саступкі ў перамовах па пастаўках нафты, паколькі расійскае кіраўніцтва больш не жадае ўтрымліваць суседа, які хацеў бы атрымліваць расійскія эканамічныя прэферэнцыі, але нічога не дае ў адказ. Лукашэнка мяркуе, што гэта складовая частка платы за геапалітычную лаяльнасць. Расійскі бок лічыць, што гэта лаяльнасць недастатковая.

**«Росбалт» (Расія)**

Эксперты сумняваюцца ў тым, што рэальным чыннікам канфлікту з'яўляецца пытанне пра лёс 850 тысяч тон нафты. У аснове цяперашняга супрацьстаяння Масквы і Мінску ляжыць пытанне пра ўдзел расійскіх кампаній у прыватызацыі беларускіх НПЗ. Цікавасць да гэтых актываў не першы год праяўляюць «Роснефть», савет дырэктараў якой узначальвае Ігар Сечын, і «Лукойл». Пакуль абодва бакі гуляюць на абвастрэнне. Але галоўным чынам абмяжоўваюцца грознымі заявамі, парушыўшы тым самым галоўную традыцыю вядзення навагодніх энергетычных войнаў: транзіт расійскіх энерганосьбітаў у Еўропу так і не быў на гэты раз перакрыты.

**«Рэспубліка» (Казахстан)**

Маскве ў гэтай сітуацыі час пазбавіцца міражоў. Уласна, гэта і адбываецца, хоць не ў яўнай форме. У салідных мужчын са Старой і Смаленскай плошчаў, якія раней ахвотна паўтаралі формулу «сучкін сын, але наш сучкін сын», назіраюцца праблемы. Падобна на тое, што пачалося ўсведамленне таго, што здарылася памылка ў тыпалогіі. Па сутнасці, мы маем справу з новым відам палітычнай жывёлы: сучкін сын, які гуляе сам па сабе.

**«Коммерсантъ» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### БАЛІВІЯ. ІНДЗЕЙСКІ «БРАНЯНОСЕЦ ПАЦЁМКІН»

Увесь балівійскі палітыкум чакае паказу стужкі «Wara Wara». Фільм быў зняты ў 1930 годзе. Пасля ўсе копіі дзіўным чынам зніклі. Толькі ў 1989 годзе былі знойдзеныя фрагменты негатыву. І толькі зараз з тых ласкутоў карціну змаглі зрабіць у першапачатковым выглядзе. Аднак цікавасць грамадства да «Wara Wara» звязана не з гэтай гісторыяй. Фішка карціны ў тым, што гэта першы фільм, зняты ў Балівіі пра індзейцаў, а менавіта пра мясцовыя індзейскія цывілізацыі да прыходу канкістадораў. У цэнтры сюжэту барацьба інкаў супраць іспанцаў. Чырвонаскурых вядзе ў бой прынцэса Трыстан. Як вядома, цяперашні прэзідэнт Балівіі Эва Маралес — заўзяты аматар аднаўлення гістарычнай справядлівасці: ён узняў палітычны статус плямёнаў, даў шмат правоў мясцовым індзейскім этнасам. Адсюль і ажыятаж вакол «Wara Wara». Застаецца дадаць, што славуты фільм пакажуць 22 студзеня, калі Эва Маралес у другі раз атрымае мандат прэзідэнта.

**Па матэрыялах «Figaro» (Францыя)**

### УКРАІНА. БОГДАН СТУПКА ПРАДАЎСЯ МАСКАЛЯМ?

Новай крыніцай вечнай, здаецца, канфрантацыі паміж Кіевам і Масквой можа стаць фільм «Мы из будущего–2», які выходзіць на расійскія экраны 18 студзеня. Па сюжэту група падлеткаў трапляе ў мінулае. У першай частцы іх занесла пад Маскву ў 1942-м. У другой яны трапляюць таксама ў часы вайны, аднак ужо ў 1944 год і на тэрыторыю Украіны. Сярод іншага яны сустракаюць атрад Украінскай паўстанцкай арміі (УПА) Сцяпана Бандэры. Бандэраўцы займаюцца тым, што знішчаюць вёску разам з яе жыхарамі. Тэма УПА вельмі супярэчлівая для Украіны. Таму негатыўная трактоўка УПА ў карціне адразу выклікала пратэсты часткі ўкраінскага грамадства. Адмысловая камісія, якая выдае ліцэнзіі на пракат ва ўкраінскіх кінатэатрах, заявіла, што можа забараніць карціну. Між тым, спецыялісты кажуць, што стваральнікі «Мы из будущего–2» спецыяльна ўставілі ў фільм бандэраўцаў, каб узняць цікавасць да свайго прадукту ва Украіне. І нарэшце: камандзіра бандэраўцаў сыграў славуты ўкраінскі акцёр Багдан Ступка, што выклікала вялікую хвалю крытыкі на яго адрас. Сам Ступка ад каментараў адмаўляецца.

**Па матэрыялах «Газета по-киевски» (Украіна)**

### МАЛАЙЗІЯ. ХРЫСЦІЯНАМ ЗАБАРАНІЛІ КАЗАЦЬ СЛОВА «АЛАХ»

Незвычайны скандал развіваецца ў Малайзіі. У яго цэнтры дэбаты вакол пытання, ці маюць правы немусульмане выкарыстоўваць слова «Алах». Малайзія, нагадаем, перадусім мусульманская краіна (тут 60 працэнтаў мусульман), дзе, аднак, існуе вялікая калонія эмігрантаў з Індыі і Кітаю. Апошнія практыкуюць каталіцызм або пратэстантызм. Яшчэ ў 2008 годзе Нацыянальны савет фатвы (нешта накшталт савету па справах рэлігіі) забараніў прыхільнікам іншых рэлігій, акрамя ісламу, казаць на публіцы слова «Алах». Аднак на мінулым тыдні ўлады дазволілі каталіцкаму часопісу «Herald Weekly» выкарыстаць згаданае слова ў адным з артыкулаў. Рашэнне выклікала выбух пратэстаў сярод мусульман. Па ўсёй краін прыйшлі маніфестацыя пад лозунгамі «Алах выключна для нас!», «Мы не дазволім, каб слова «Алах» прысутнічала ў вашых царквах!». Вулічнымі акцыямі, на жаль, справа не абмежавалася. Былі падпаленыя тры хрысціянскія царквы.

**Па матэрыялах «Le Monde» (Францыя)**

### АЗЕРБАЙДЖАН. ЗА ДЭРУСІФІКАЦЫЮ ПРОЗВІШЧАЎ

У Азербайджане пачалася дзяржаўная кампанія па дэрусіфікацыі прозвішчаў. Яе мэта — адаптаваць прозвішчы жыхароў краіны да нацыянальнай мовы. Канцэпцыя рэформы была прапрацавана вучонымі-філолагамі з Акадэміі навук. Адзін з іх, Нізамі Джафараў, быў дакладчыкам на пасяджэнні спецыяльнага камітэту парламенту, які даў згоду на змены. Сама рэформа, між тым, дастаткова прымітыўная. Усе прозвішчы, якія маюць канчатак «ов» , «ев» (у жаночым варыянце «ова» або «ева») павінны быць замененыя на канчаткі цюркскага паходжання «лі», «лу», «оглу», «гіл». Рэформа не будзе тычыцца прозвішчаў азербайджанскіх грамадзян іншаземнага паходжання. Калі непасрэдна пачнецца кампанія, вырашаць дэпутаты.

**Па матэрыялах Trend.az (Азербайджан)**

### ЗША. ГІТЛЕР БЫЎ НЕ ВІНАВАТЫ

Олівер Стоўн, культавы кінарэжысёр левых (ён здымаў такія стужкі, як «JFK», «Wall Street», вялікія інтэрв'ю з Кастра і Чавесам), зрабіў цікавы піруэт направа. Олівер зняў дакументальны фільм «Сакрэтная гісторыя Злучаных Штатаў». Стужка была паказаная адным з амерыканскіх каналаў і ўжо выклікала скандал. Калі б у цітрах не стаяла прозвішча Олівера Стоўна, можна было падумаць, што карціну зняў нейкі фанат Гітлера. Гісторыя ЗША, па Стоўну, абсалютна адпавядае праварадыкальным трактоўкам гісторыі другой сусветнай вайны. На думку рэжысёра, фюрэр Трэцяга рэйху аказаўся «стрэлачнікам». Маўляў, ён нарабіў зла не больш, чым Сталін, аднак стаўленне да апошняга куды лепш. Пакуль што левая грамадскасць ЗША і Еўропы не ведаюць, як рэагаваць, і са страхам чакаюць прэм'еры карціны.

**Па матэрыялах ABC (Іспанія)**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ



# ГУМАННАЯ СМЕРЦЬ

Алег ПЯТРОЎ

**Новы метад смяротнага пакарання апрабавалі ў штаце Агайо на Кенеце Бірасе, які, думаецца, менш за ўсё хацеў такой славы. Кенет, дарэчы, быў пакараны за забойства і згвалтаванне 22-гадовай дзяўчыны. Забіўшы ахвяру, ён парэзаў цела нябожчыцы на часткі, якія закапаў. Хутка, аднак, яго чакалі арышт, суд і смяротны вырак.**

Навізна новага метаду пакарання ў тым, што злачынцу забілі праз увядзення яму ў вену дозы ціапенталу. Раней для падобных спраў ужывалі так званы «тэхаскі кактэйль» — пентатал натрыю, павулон, хларыд калію. Прыхільнікі новага прэпарату сцвярджаюць, што ім удалося знайсці доўгачаканую форму гуманнага пакарання.

Аднак перш за ўсё трэба згадаць эвалюцыю сродкаў смяротнага пакарання ў ЗША. Пачыналася ўсё яшчэ ў часы каланізацыі, калі на месцах панаваў закон Лінча. Па яго правілах, таго, каму выносілі прысуд, чакала шыбеніца. Прыкладна сто гадоў таму з развіццём тэхналогій і пашырэння гуманістычных дактрын у моду ўвайшлі электрычныя крэслы.

Методыка забойства асуджанага праз электрычнае крэсла простая: падаецца ток у 2700 вольт. Доўгі час казалі, што гэты спосаб — вельмі гуманны. Быццам ахвяра не адчувае болю (ток, сцвярджалі аматары гэтага тэзісу, разбурае аддзелы нервовай сістэмы, адказныя за боль, у 30 раз хутчэй, чым пры іншых сродках пакарання). Праціўнікі пераконвалі, што ўсё гэта — чыстая тэорыя, і спасылаліся на выпадкі, калі праз асуджаных былі вымушаны прапускаць ток некалькі разоў. Былі прэцэдэнты, калі падчас экзекуцыяй у іх ад болю вылазілі з арбіт вочы.

Прыблізна з 1960-х гадоў у большасці штатаў сталі прызнаваць электрычнае крэсла брутальным і нават супярэчным канстытуцыі сродкам пакарання. На той час існавалі іншыя формы расправы над злачынцамі — газавая камера, шыбеніца, расстрэл. Аднак у якасці альтэрнатывы электрычнаму крэслу перамагла смяротная ін'екцыя.

Сцэна пакарання праз ін'екцыю выглядае наступным чынам. Асуджаны фіксуецца на спецыяльным крэсле. Яму ўводзяць у вену іглу кропельніцы. Праз гэту кропельніцу і ўводзіцца той самы славуты кактэйль. Яго інгрэдыенты, нагадаю, пентатал натрыю, павулон, хларыд калію. Першы ўжываецца для анестэзіі, другі паралізуе мускулатуру, нарэшце, трэці прыпыняе працу сэрца. Смерць наступае на працягу трох хвілін. Лічыцца, што сама ахвяра болю не адчувае. Яна быццам пагружаецца ў глыбокі сон.

Упершыню ідэю смяротнай ін'екцыі прапанавалі яшчэ ў 1888 годзе. Аднак толькі ў 1977 годзе штат Аклахома стаў першым, дзе смяротная ін'екцыя была прызнаная афіцыйным метадам пакарання. З таго часу колькасць штатаў, дзе практыкуюць такі спосаб пакарання, пашырылася да 38.

Крытыкі смяротнага пакарання хутка знайшлі ў такім спосабе недапрацоўкі. Цудоўны «кактэйль» аказаўся не такім ужо стопрацэнтным сродкам. Здаралася, агонія ахвяр цягнулася доўгі час. Смутны рэкорд паставіў Джэймс Кларк, якога пакаралі ў тым жа Агайо. Ён паміраў 90 хвілін. Пры гэтым крычаў: «Яно не працуе». Турэмная служба не ведала, што рабіць. Нарабіла скандалу і справа Ромела Брума, якога катавалі 15 верасня мінулага года ў тым жа Агайо. На працягу дзвюх гадзін медыкі не маглі трапіць яму ў вену. Нарэшце трапілі... шпрыцам у косць. У выніку губернатар штату (па іроніі, сам былы турэмшчык з аддзелу смяротных пакаранняў) загадаў адмяніць працэдуру. Ромела (якога, дарэчы, судзілі за забойства 14-гадовай дзяўчыны) адправілі на нары. Цяпер чакаюцца дадатковыя слуханні па ягонай справе. У Фларыдзе смяротную ін'екцыю забаранілі пасля таго, як турэмны доктар памылкова трапіў асуджанаму іглой у мышцу, а не ў вену. У выніку апошні паўгадзіны да смерці вельмі пакутаваў ад болю.

Застаецца дадаць, што раней за ЗША ідэю смяротнай ін'екцыі прыдумалі нацысты. Лідэр нямецкіх камуністаў Эрнст Тэльман быў забіты менавіта такім чынам.

Асноўныя праблема ў тым, што дазіроўка прэпаратаў часта парушаецца (пра гэта сведчаць вынікі ўскрыцця пакараных у некаторых штатах). Прычым у некаторых з іх канцэнтрацыя абязбольваючых была ніжэй, чым неабходна пацыенту нават для хірургічнай аперацыі. Адказам на крытыку стала прапанова ўводзіць не «кактэйль», а адзін прэпарат. Мова пра ціапентал натрыю (яго выкарыстоўваюць у медыцыне для кароткачасовай амнезіі), перадазіроўка якога выклікае смерць.

Наколькі забойства з дапамогай ціапенталу можа лічыцца гуманным? Дэбаты на гэты конт толькі пачынаюцца. Апаненты смяротнага пакарання ўжо сцвярджаюць, што пры такім спосабе фактычна адсутнічае анестэзія.

Вынікі дэбатаў хутчэй за ўсё будуць залежыць ад агульнага стаўлення амерыканцаў да практыкі ўжывання смяротнага пакарання. Сёння яна перажывае некаторы рэнесанс у параўнанні з 1990-мі гадамі. Аднак спецыялісты кажуць, што ў прынцыпе назіраецца тэндэнцыя на карысць паступовай адмены экзекуцый. Палова амерыканцаў працягвае падтрымліваць смяротнае пакаранне, аднак пры гэтым яны ў большасці выступаюць за дэталёвае следства і суд і пры гэтым не задаволеныя тым, што праз падаткі павінны фінансаваць утрыманне падазронага ў турме на працягу ўсяго жыцця. Між тым, самі суддзі, навучаныя справамі, калі пакараныя смерцю ў выніку аказваліся невінаватымі, не вельмі ахвотна падпісваюць смяротныя вердыкты.

У заключэнні можна згадаць, што ціапентал доўгі час лічыўся сывараткай праўды, пад уздзеяннем якой чалавек быццам не можа хлусіць. Відома, што шматлікія разведкі сапраўды праводзілі эксперыменты з ціапенталам, аднак практычных вынікаў гэтыя доследы не мелі.

ВЫБАРЫ

# АДНЫМ МІРАМ МАЗАНЫЯ

**Ва Украіне заканчваецца прэзідэнцкая выбарчая кампанія, якая традыцыйна не абышлася без стварэння негатыўных вобразаў канкурэнтаў. Які кампрамат быў выліты на вядучых кандыдатаў і як гэта паўплывала на іх імідж? Пра гэта — меркаванне ўкраінскага палітолага Юрыя Дакукіна.**




Кандыдат нумар адзін — Віктар Юшчанка. З палітыка, які меў рэйтынг 54 працэнта на пачатку 2005 года, ён ператвараўся ў «чалавека-кефір» (намёк на тое, што ягоны рэйтынг падобны на працэнт тлустасці кефіру — у межах трох працэнтаў). Аднак агрэсіўная кампанія прымушае ворагаў Юшчанкі разглядаць яго як сур'ёзнага праціўніка і, адпаведна, рэгулярна паліваць брудам. Для аранжавых ён чалавек, які прафукаў Майдан. Для бела-сініх — дасюль інкарнацыя ненавіснага Майдану. Новыя тэмы — Юшчанка нашчадак Кучмы. Інакш цяжка зразумець, як кажуць ягоныя ворагі, намаганні прэзідэнта напярэдадні выбараў унесці ў Канстытуцыю папраўкі і застацца пры ўладзе. Спробы распачаць праз пракуратуру справу супраць прэм'ера БЮТ, напрыклад, разглядае таксама як другую рэдакцыю кучмаўскай спробы засадзіць Цімашэнка за краты.

Другі кандыдат — Юлія Цімашэнка. Траекторыя вобразу Юліі ў агітацыі яе крытыкаў вельмі цікавая. За пяць гадоў яна ператварылася для сваіх праціўнікаў з нацыяналісткі ў пятую калону Крамля. Пра наяўнасць кантактаў з Крамлём, на думку яе апанентаў, кажуць рэгулярныя візіты ў Маскву, асцярожнае стаўленне да яе ў традыцыйна антыўкраінскіх маскоўскіх СМІ. Яшчэ ўвосень пайшлі чуткі пра тое, што Пуцін мае на Юлію кампрамат яшчэ з часоў, калі яна займалася экспартам газу. І цяпер Цімашэнка быццам на кручку. Развіваючы тэму, Юшчанка абвінавачвае Цімашэнка ў тым, што па заданню Масквы яна плаціць «Газпраму» сродкамі з нацыянальных золата-валютных рэзерваў. Януковіч заяўляе, што Юлія марыць устанавіць у краіне дыктатуру пуцінскай мадэлі. Хапае абвінавачванняў супраць Цімашэнка за выкарыстанне адміністратыўнага рэсурсу падчас выбараў і нават у запланаваных фальсіфікацыях.

Наступны кандыдат — Віктар Януковіч. Праз пяць гадоў пасля аранжавай рэвалюцыі Януковіч, здаецца, пазбавіўся іміджу агента Масквы. Яму нават рэдка згадваюць тое, што ён быў пратэжэ Кучмы. А вось пазбавіцца рэнаме данецкага бандыта ад палітыкі Віктару Фёдаравічу цалкам не ўдалося. Ён, як і раней, у вачах многіх украінцаў выглядае былым зэкам, што ахвотна мусіруецца ягонымі праціўнікамі. Натуральна, як буйному алігарху, яму трэба адказваць на абвінавачванні ў карупцыі. Прынамсі падчас выбарчай кампаніі ўсплыла тэма комплексу Міжгір'я, які дзіўным чынам перайшоў ва ўласнасць Януковіча. Бліжэй да выбараў Януковіча пачалі актыўна абвінавачваць у спробах паўтарыць электаральныя махінацыі 2004 года. Сярод новых пазіцый, з якіх крытыкуюць лідэра Партыі рэгіёнаў, — апартунізм. У час свайго прэм'ерства 2006 года ён не зрабіў нічога з таго, што абяцаў электарату. Рэваншу, які шмат хто чакаў, не атрымалася. Змен не было нават у культурнай сферы, якая быццам не тычылася важных для данецкай групоўкі эканамічных інтарэсаў. Маем на ўвазе абарону рускай мовы, супрацьстаянне ўкраінізацыі.

**Агрэсіўная кампанія прымушае ворагаў Юшчанкі разглядаць яго як сур'ёзнага праціўніка. Для аранжавых ён чалавек, які прафукаў Майдан. Для бела-сініх — інкарнацыя ненавіснага Майдану**

Ёсць яшчэ Сяргей Цыгіпка. Крытыкі падаюць яго як тэхнічнага кандыдата БЮТ, які павінен адвесці ад Януковіча частку яго ўсходнеўкраінскага электарату. Пасля таго, як Цыгіпка некалькі разоў выступіў супраць БЮТ, яму сталі ўзгадваць ягонае алігархічнае мінулае. Задавацца пытаннем, якім чынам былы вайсковец, якім быў Цыгіпка да перабудовы, скалаціў капітал у два з паловай мільярды долараў. Прыпомнілі яму і выпадак 2004 года, калі ў разгар аранжавай рэвалюцыі Сяргей пакінуў штаб Януковіча, дзе працаваў кіраўніком. Гэтыя ўцёкі разглядаюць як учынак труса. «Моцны прэзідэнт — гэта новая гандлёвая марка памперсаў для дарослых, якую рэкламуе драпаючы кандыдат», — адна з ацэнак, якую даюць Цыгіпку ягоныя праціўнікі. Сорамна, аднак не абышлося тут і без бытавога нацыяналізму. Цыгіпка мае малдаўскія карані, што адразу было выкарыстана супраць яго. Пайшлі ў ход шматлікія малдаўскія анекдоты і г.д.

Арсеній Яцэнюк — наступны кандыдат. Самая брудная кампанія была менавіта супраць яго. У яе цэнтры былі антысемітызм і агрэсіўны нацыяналізм. Пускалі чуткі пра яго быццам габрэйскае паходжанне. Антысемітызмам справа не абмежавалася. Звярнулі ўвагу на тое, што Яцэнюк з Букавіны, дзе шмат уніятаў. Узнікла новая нацыянальная ідэнтыфікацыя Арсенія «грэка-каталіцкі габрэй». У дадатак казалі, што ён тэхнічны кандыдат Цімашэнка, якога яна наняла, каб раскалоць электарат Юшчанкі ў Заходняй Украіне. Аднак, здаецца, шмат хто не прабачыў яму дастаткова маладога для ўкраінскага палітыкуму ўзросту.

Кандыдат у прэзідэнты Алег Цягнібок — правадыр вядучай нацыяналістычнай партыі «Свабода». Таму для большасці электарату з Усходняй Украіны ён — фашыст. Тут піяршчыкам яго праціўнікаў і працаваць было не трэба. Варта адзначыць, што амаль не было наездаў на Цягнібока з прычыны яго сувязяў з ценявым бізнесам, непразрыстай прыватызацыяй. Рэдкая справа для акцёраў украінскай палітыкі вышэйшага дывізіёну.

Нарэшце, Уладзімір Літвін, старшыня Вярхоўнай Рады. Яму спрабавалі прыпісаць удзел у выкраданні і забойстве журналіста Гангадзе. У той час, калі выбухнуў скандал, Літвін працаваў у камандзе Кучмы. Аднак галоўным чынам яму спрабавалі стварыць імідж слізкай асобы, інтрыгана.

Застаецца дадаць, што кампаніі па стварэнню негатыўнага вобразу і выкід кампрамату даўно сталі алгарытмам нашай украінскай палітыкі. Можна па-рознаму гэта разумець і разглядаць. Магчыма, гэта кагосьці і шакіруе. Але так ці інакш палітыкам даводзіцца рэагаваць на крытыку і выносіць нейкія ўрокі.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### НУРСУЛТАН НАЗАРБАЕЎ

Спраўдзілася даўняя мара прэзідэнта Назарбаева — з 1 студзеня 2010 года Казахстан стаў старшынёй АБСЕ. Падзея выклікала шмат крытычных каментараў з боку апазіцыі. Справа нават не ў тым, што саму ідэю наконт таго, каб узначаліць АБСЕ прапанаваў калісьці Нурсултану яго былы зяць Рахат Аліеў (цяперашні самы вялікі асабісты вораг Назарбаева, які хаваецца ў Аўстрыі). Казахстан — краіна з вельмі супярэчлівымі стандартамі дэмакратыі (тут, напрыклад, існуе цэнзура інтэрнэта і крымінальная адказнасць за выказванні ў блогах). Дадатковай падставай для крытыкі стала 10-я гадавіна так званай «справы Пучагова». Напрыканцы 1999 года ва Усць-Каменагорску, што на поўначы краіны, былі арыштаваныя 12 асобаў. Яны, калі верыць файлам Камітэта нацыянальнай бяспекі (КНБ), рыхтавалі захоп мясцовай адміністрацыі і стварэнне ў рэгіёне асобнай краіны «Расійская зямля». У якасці доказаў КНБ дэманстраваў улёткі, а таксама зброю (адна граната, патроны і 14 пляшак з бензінам). Ініцыятарам і лідэрам путчыстаў, калі верыць КНБ, быў нехта Віктар Казімірук па мянушцы Пугачоў. Ён быццам падтрымліваў кантакты з расійскімі экстрэмістамі (у той жа час па справе Пугачова ў Расіі быў арыштаваны Эдуард Лімонаў — лідэр нацыянал-бальшавікоў). За падрыхтоўку паўстання Казімірук-Пугачоў атрымаў 10 гадоў, якія адсядзеў, і цяпер кажа, што ўсё гэта было чыстай правакацыяй. Здаецца, што так і ёсць. Нягледзячы на тое, што арышт сепаратыстаў-пугачоўцаў можна лічыць самай буйнай паспяховай акцыяй у гісторыі КНБ, яе цяперашнія кіраўнікі не жадаюць згадваць пра тую бліскучую перамогу.



### ГРЭГАР ГІЗІ

Грэгар — былы функцыянер ГДР, а зараз адзін з лідэраў партыі Левыя. Левыя, як вядома, зрабілі сенсацыю ў нямецкай палітыцы. Партыя былых усходніх нямецкіх камуністаў, дзякуючы перабежчыку былому сацыял-дэмакрату Оскару Лафантэну, пазбавілася іміджу партыі «осі» і на хвалі падзення рэйтынгу эсдэкаў стала чацвёртай партыяй краіны. Шматлікія эксперты нават прагназуюць яе ўваход у нацыянальны ўрад па выніках наступных выбараў у 2016 годзе. Аднак амбіцыі Гізі могуць паставіць крыж на праекце. Пасля таго, як Лафантэн заявіў, што хворы на рак, Гізі паступова пачаў казаць, што хацеў бы заняць месца Оскара ў крэсле старшыні партыі. Навіна выклікала аўтаматычна негатыўную рэакцыю з боку фракцыі «весі»: шматлікія лідэры дасюль прынцыпова нават не паціскаюць руку Гізі, памятаючы, як у 1980-я гады ў ГДР тагачасныя сябры і таварышы Гізі праследавалі незалежны працоўны рух. Цікава, што галоўным канкурэнтам Гізі выступае таксама былы ўсходні нямецкі камуніст Дзітмар Бартш. Апошні кажа, што партыі трэба пазбаўляцца «зорак» і рабіць нармальны апарат. Інтрыга вакол будучыні партыі Левыя часткова раскрыецца ў маі, калі ў Ростаку адбудзецца партыйны з'езд і абранне новых кіраўнікоў.

### ТОНІ БЛЭР



Сенсацыяй стала рашэнне былога прэм'ер-міністра брытанскага ўраду, экс-старшыні партыі лейбарыстаў Блэра ўладкавацца на працу ў фірму «Louis Vuitton». Фірма, як вядома, спецыялізуецца на аксесуарах класу люкс (кошт некаторых сумачак ад «Louis Vuitton» дасягае 1,5 тысяч долараў). Пераход Блэра на працу ў фірму з падобным рэнамэ называюць самай вялікай паразай брытанскага сацыялізму апошніх часоў. Праблема не ў тым, што Блэр яшчэ нядаўна казаў, што «лейбарысты — партыя тых, хто выступае за роўнасць». «Louis Vuitton» мае вельмі супярэчлівую з пункту гледжання левых актывістаў і прыхільнікаў этычнага спажывання, гісторыю. Заснавальнік фірмы пабудаваў свой бізнес падчас вайны на заказах ад ураду маршала Петэна — французскай марыянеткі Гітлера. Пасля вайны фірма была звязаная з «De Beers» — бельгійскай кампаніяй па здабычы дыяментаў, якая праславілася тым, што ваявала з прагрэсіўнымі ўрадамі Паўднёвай Афрыкі. Адным словам, Блэра ўсе дружна запісалі ў ворагі сацыялізму і дэмакратыі. Прыхільнікі Блэра, якіх, праўда, не шмат, кажуць, што не ўсё так проста. Напрыклад, Міхаіл Гарбачоў, чый імідж змагара за дэмакратыю бясспрэчны, у 2007 годзе наведаў калядны прыём арганізаваны «Louis Vuitton».

▸ ЦІКАВА

# ДВА МАСТАКА — ДВА ЛЁСЫ

Сяргей ГВАЗДЗЁЎ

## Пётр Міранович. Беларускі мастак у ЗША

**Імя мастака Пятра Міранoвіча (1902–1990) трывала знітавана з мастацкай творчасцю беларускай дыяспары Паўночнай Амерыкі, дзе ён стала жыў і працаваў пасля вучобы ў Венскай акадэміі мастацтваў.**



Пётр Міранович

### Усё Бацькаўшчыне

Век свайго жыцця аддаў Міранович творчасці і Бацькаўшчыне — Беларусі. Усё, што рабіў, — займаўся жывапісам, удзельнічаў у нацыянальных і агульнаамерыканскіх мастацкіх выставах, чытаў лекцыі, пісаў артыкулы пра беларускую культуру і асвету, — жыў Радзімай.

З ініцыятывы Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку ў 1964 годзе была праведзена яго персанальная выстава. Больш за 60 твораў асвятлялі творчыя дасягненні майстра на амерыканскім кантыненце. Як паведамляла эміграцыйная прэса, на ёй экспанаваліся партрэты беларусаў-выгнаннікаў, краявіды Латгаліі, намаляваныя па замалёўках і фотаздымках, прывезеных мастаком з радзімы, а таксама вядомая па шматлікіх выставах і рэпрадукцыях карціна «Беларускія эмігранты». Не выклікае здзіўлення і асаблівых пярэчанняў думка паказаць некалькі работ мастака ў экспазіцыі «Мастакі беларускай дыяспары» ў музеі Гісторыі і культуры Беларусі.

Разам з гэтым ёсць пытанне, як ставіцца да міжваеннага даробку майстра, які нарадзіўся ў этнічна беларускім асяродку цяперашняй Латвіі: у вёсцы Стрэмкі, Піедруйскай воласці, Краслаўскага павету. Як — праз прызму мастацтва беларускай дыяспары ў Амерыцы ці ў кантэксце «заходнебеларускай мастацкай плыні» — разглядаць творчасць мастака даваеннага перыяду, які пасля заканчэння Краслаўскай латышскай школы паступіў у Даўгаўпілскую дзяржаўную беларускую гімназію?

Гэта найпершае пытанне для мастацтвазнаўцаў-адмыслоўцаў. Для аматараў мастацтва, зразумела, найпершае — убачыць творы мастака.

### Пачатак

Навучаўся Пётр Міранович у Латвійскай акадэміі мастацтваў (1928–1933), рэктарам якой быў вядомы мастак і педагог, аднакашнік прафесара Рушчыца, прадстаўнік паўночнага Адраджэння — Вільгельм Пурвіт. Азы прафесіі Пётр засвойваў у майстэрні дэкаратыўнага жывапісу ў прафесара Яніса Кугі, а з 1933 па 1937 гады — у майстэрні кампазіцыі прафесара Гедэрта Эліяса, у якога і абараніў у 1937 годзе дыпломную працу «У сялянскай хаце».

Па заканчэнні акадэміі Міранович далучаецца да творчага асяродка Латвіі і плённа працуе ў розных жывапісных жанрах: краявіды Латгаліі, сюжэты з жыцця аўтахтонных беларусаў Латвіі, партрэты беларускай інтэлігенцыі, робіць касцельныя роспісы, малюе абразы. Удзельнічае ў выставах латышскіх мастакоў, выстаўляе свае творы «Адліга», «Латгалачка», «Вандраванне», «Вяртанне дадому» і іншыя на Чацвёртай мастацкай выставе Фонду культуры Латвіі ў 1937 годзе. Разам з гэтым Пётр Міранович займаецца асветна-педагагічнай дзейнасцю, выкладае маляванне, з'яўляецца сябрам Таварыства беларускіх настаўнікаў у Латвіі, падчас вайны спачатку працуе інспектарам беларускіх школаў, а потым рэферэнтам па пытаннях культуры.

### Арсеннеўскія вобразы

Андрэй Зарэчны (псеўданім паэта Хведара Ільяшэвіча) у адным з артыкулаў адзначаў, што светаадчуванне Міранoвіча, яго «падыход да сучаснасці сугучны тону і настроям, пануючым ў навейшай (паслянашаніўскай — С.Г.) літаратуры».

Намаганні наноў народжанай беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя, як і выяўленчага мастацтва, былі скіраваныя на фізічнае сцвярджэнне беларуса ў свеце. Дэкларатыўна-культавыя («знакавыя») творы тэматычнага жывапісу, з іх прыглушана каларыстычнай гамай, гэткім своеасаблівым рэхам «прадметнага колеру позніх перадзвіжнікаў» арганічна спалучаліся з паэтычнымі радкамі кшталту: «Край мой родны, край мой бедны, гразь, балоты ды пясок, ледзь дзе крыху луг прыгодны, хвойнік, мох ды верасок: а туманы, як пялёнкі засцілаюць лес і гай — ах ты бедная старонка, ах забыты Богам край».

Паэзія міжваеннага перыяду не імгненна, але пазбаўлялася «празмернай сентыментальнай расчуленасці і бедавальніцтва над краям і доляй, занесенай у нашу літаратуру чужым расійскім народніцтвам», — адзначае Андрэй Зарэчны.

Пётр Міранович не кан'юнктурна падаўжае і паглыбляе цэнтраўтвараючую, магістральную тэму заходнебеларускага мастацтва на новым узроўні, адпаведна паэтычнаму «тону» часу, а перагукаецца з паэзіяй Наталлі Арсеньевай ў трактоўцы чалавека, аднак ў больш аптымістычных каларыстычных рашэннях.

У Андрэя Зарэчнага, які меў музычны слых на слова і добры густ на колер, жывапіс Міранoвіча абуджаў арсеннеўскія вобразы. Нездарма, займаючыся асветна-выхаваўчай працай і папулярызуючы творчасць мастака, Беларускі студэнцкі саюз (Вільня) выдаваў паштоўкі з яго творамі.

### Між зямлёй і небам

У даваенных кампазіцыях Пятра Міранoвіча чалавек «між зямлёй і небам» не толькі прысутны, але і дзейны. Шырока і годна крочыць па веснавой раллі, хай і не надта заможны сейбіт («Сяўба»). З хваламі стыхіі з усёй моцы змагаюцца дзвінскія плытагоны («Ганкі плывуць»). У яго творах мы бачым розныя характары і людскія тыпы, гатовыя бараніць плён сваёй працы («Бура на сенакосе»). Не выпадкова паўстала і цэльная партрэтная галерэя стваpаных ім вобразаў — Скарына, Сапега, Каліноўскі, Купала, якая натуральна падаўжаецца выявамі выдатных асобаў нашага часу: Арсеннева, Салавей, Сядура, Сахараў. (У дадзеным выпадку незалежна ад таго, дзе яны былі напісаны).

Мяркую, што ёсць усе падставы аднесіць даэміграцыйны перыяд творчасці (тэматычна і эстэтычна) мастака беларускай дыяспары ў Амерыцы Пятра Міранoвіча да «заходнебеларускай мастацкай плыні». Бо колькі гэту плынь не перагароджвалі ўздоўж і ўпоперак, нічога з гэтага не атрымалася.



Петр Міранович. «Суседкі»

## Васіль Сідаровіч. Беларускі мастак у СССР

**«Сідаровіч як жывы стаіць перад маімі вачыма і сёння. Высокі, худы, маляваў вельмі многа і, здаецца, меў немалы талент. Аднак з навукай цяжкавата прыходзілася яму. Пераехаў у Мінск, і на гэтым нашы кантакты перарваліся».**



Васіль Сідаровіч. 30-я гады. Віцебск

Так узгадвае мастака Васіля Сідаровіча ў сваіх успамінах («На жыццёвым шляху» — Мн.: Маст. літ., 1992), напісаных па вяртанні з варкуцінскіх лагераў у 1956 годзе Ян Антонавіч Багдановіч, «Дзядзька Янка» (1906–1990) — выдавец часопіса «Шлях Моладзі», журналіст і настаўнік, адзін з рухавікоў нацыянальнага і грамадска-культурнага станаўлення ў Заходняй Беларусі, згадваючы мастацкія таленты ўтрымаанцаў прытулку Віленскай беларускай гімназіі.

Да крыўднага мала вядома пра гэту асобу. Трагічны лёс таленавітага заходнебеларускага юнака, які ва ўмовах польскай анексіі і ўзмацнення рэпрэсіяў шчыра звабіўся на святло з Камуністычнага Усходу.

### Польскі шпіён

Гэтая біяграмка-напамін, не прыўносіць нічога новага, але мае сэнс, бо культура робіцца «не з навінаў, а з успамінаў», ды і ніхто, здаецца, яшчэ не адмяніў біблейскую ісціну — «як памятаем мы, так будуць памятаць і нас».

Васіль нарадзіўся ў 1905 годзе ў маленькай вёсачцы Сівіца на Віленшчыне (зараз Смаргонскі раён Гродзенскай вобласці) і быў малодшым з братоў. Усяго ў сям'і селяніна Лукаша было трое сыноў і дзве дачкі.

Ад пачатку 20-х гадоў праз не надта маёмасны стан бацькоў жыў у гімназічным прытулку разам з будучымі паэтам Алесем Салагубам, мастаком Раманам Семашкевічам і здабываў асвету ў Віленскай беларускай гімназіі. Як і шмат хто, быў прыхільнікам ідэяў грамадства сацыяльнай роўнасці і, адпаведна, сябрам падпольнага Камуністычнага Саюза Моладзі Заходняй Беларусі.

Азы малявання засвойваў саматугам, а ад 1926 года ў майстэрні-студыі Язэпа Драздовіча пры беларускай гімназіі. З гэтага часу паказвае сваю палітычную графіку ў гімназічных перыёдыках, якія выдавалі камсамольцы ВБГ — «Золак», «Покліч», а таксама ў часопісе «Рунь». У 1926–1928 гадах яго сацыяльна завостраныя абразкі раз-пораз з'яўляюцца ў беларускім сатырычным часопісе «Маланка».

Напрыканцы 1920-х Васіль Сідаровіч, па прыкладу старэйшага сябра Рамана Семашкевіча, які перайшоў «зялёную мяжу», уцёк у Савецкую Беларусь.

Трапіўшы з Мінску ў Віцебск, пасля непрацяглага навучэння ў мастацкім тэхнікуме быў высланы ў Чэлябінск. Там паднадзорны мастак працаваў сцэнографам у тэатры, пакуль яго, «як эмігранта і польскага шпіёна,» не расстраляла НКУС у 1937 годзе. Імя рэпрэсаванага мастака не трапіла ні ў беларускія мартыралогі, ні ў расійскія мемарыялы.

### Спадчына

Спадчына Васіля Сідаровіча выяўлена, не кажучы пра вывучанасць, слаба.

Нізкі яго графічных твораў («Хоць гультаём мяне завуць, а з працы ўсе маёй жывуць», «Што Рыгор у свеце бачыў», «Беларусь, ты прабудзжайся, ашукаць сябе не дайся», «І на зямлі, і пад зямлёй «апякун» усё за табой» і інш.), якія не страцілі сваёй актуальнасці і сёння, друкаваліся ў 1930-я гады ў віленскіх беларускіх выданнях.

Апрача захаваных у прыватных калекцыях жывапісных спробаў Васіля Сідаровіча 1920–1930-х гадоў («Ручай», «Вясна», «Ваколіца вёскі Селіцы», «Стагі за ваколіцай» і інш.), работы яго, пэўна, ёсць і ў дзяржаўных установах Віцебска, Чэлябінску. Але шукаць іх там прыватным чынам «па-партызанску» не выпадае. Патрэбна дзяржаўная зацікаўленасць, спрыянне ва ўзнаўленні памяці і «вяртанні» мастака.

Але пакуль што жывапісны абразок Васіля Сідаровіча — бадай адзіны візуальны напамін пра творцу трагічнага лёсу, не трапіў у экспазіцыю выставы «Заходняя Беларусь у выяўленчым мастацтве», якую наладзіў НММ пад 70-я ўгодкі Уз'яднання.

Не віна ў тым ні каардынатара выставы, ні экспазіцыянераў.

СПАДЧЫНА

# КАРТУЗІЯ СВЯТОГА КРЫЖА

Кастусь ТАРАСАЎ

**У Бярозе адбудоўваюцца ўязная брама і шпіталь самага вялікага ў Беларусі кляштара картузіянцаў. Ва ўсёй Рэчы Паспалітай мелася ўсяго тры картузіянскія кляштары ўключна з тым, які быў закладзены каля Гданьска яшчэ пры крыжаках.**


Леў Сапега


Казімір Сапега

## Заснавальнікі

Леў Сапега, канцлер, гетман ВКЛ, вядомы як заснавальнік цэлага шэрагу касцёлаў. Нарадзіўшыся ў праваслаўнай сям'і, ён у 17 гадоў, калі вучыўся ў Лейпцыгскім універсітэце, перайшоў у кальвінізм, а ў 1585 годзе, атрымаўшы пасаду падканцлера ВКЛ, — у каталіцтва.

Леў Сапега ахвяраваў сродкі на будаўніцтва касцёла Міхаіла Архангела ў Вільні, заснаваў касцёл Святой Сёмухі ў Ружанах, а ў 1624 годзе — Дзятлаўскі касцёл. Заснавальнікам Гарадзенскага касцёла дамініканцаў быў Фрэдэрык Сапега. Касцёл і манастыр францысканцаў у Гальшанах пабудаваныя Паўлам Стэфанам Сапегам у 1618 годзе. Траецкі касцёл бернардынаў у Друі з'явіўся на ахвяраванні Казіміра Сапегі ў 1646 годзе. Яго ж стараннямі і на яго сродкі быў адкрыты тэалагічны факультэт Віленскай Акадэміі, якой ён перадаў таксама бацькаўскую бібліятэку ў тры тысячы тамоў. Але найбагацейшы «фундуш» — 10000 залатых манет — Казімір Сапега вылучыў на будаўніцтва кляштара картузіянцаў у Бярозе.



## Выпадковая пакупка

Яшчэ ў 1590 годзе Леў Сапега атрымаў ад удавы Стэфана Баторыя, каралевы Ганны, вёску Блудзень, землі якой суседнічалі з Бярозай. У 1611 годзе Сапега па выпадку купляе Бярозу, але праз тры гады прадае яе Марціну Нямiры, які, аднак, улез у даўгі перад габрэйскім кагалам. Па гэтай прычыне Сапега ў 1617 годзе адкупіў Бярозу і землі, яе якія атачалі, за 24000 злотых. Спробы некаторых аўтараў прыпісаць Льву Сапегу жаданне ўпрыгожыць Бярозу картузіяй не маюць дакументальнага пацверджання. Ён памёр у 1633 годзе.

У 1648 годзе пачынаецца ўзвядзенне кляштару картузіянцаў. Асноўнае будаўніцтва працягвалася без малога дваццаць гадоў. На гэты час выпалі паўстанні ва Украіне і Беларусі, затым вайна, вядомая ў нашай гісторыі пад назвай Патопу. У недалёкім Янове украінскія казакі ў 1657 годзе падверглі варварскай кары езуіцкага прапаведніка Андрэя Баболю. Не пашкадавалі б і кляштара, але сцены манастыра і касцёла толькі пачыналі падымацца над падмуркам і чуткі аб картузіянцах яшчэ не будзілі агрэсіўнай цікавасці.

## Загадкавыя картузы

Паводле волі заснавальніка, касцёл атрымаў назву Святога крыжа, святога Казіміра і святога Юзэфа. Першым плябанам манастыра стаў айцец Ян Хаген з картузіі Парадзіс каля Гданьска, і першыя шэсць братоў-картузіянцаў былі адтуль жа. Эрэмы (жытло) манахаў размяшчаліся з трох бакоў замкнёнага манастырскага двара. Галерэя злучала іх з касцёлам. Шэсць эрэмаў былі гатовыя да дня асвячэння, астатнія восем — «уступілі ў лад» у 1689 годзе. З мясцовага жыхарства першым картузіянцам стаў Мікалай Крываблоцкі, які правёў у кляштары наступныя 45 гадоў. Мовай службаў, малітваў, зносін у Бярозаўскай картузіі была лацінская. Картузы не вялі прапаведзі сярод мясцовага насельніцтва, нават ад вернікаў у касцёле іх аддзяляла каменная сцяна, за якою яны сядзелі ў крэслах, падобных на келлі, адмежаваных адна ад адной.

Па легендзе, падканцлер Казімір Сапега спыніў свой выбар на ордэне картузаў з-за павагі да іх самапазнання ў Богу. У рэальнасці картузы з кляштара Парадзіс самі звярнуліся да яго з лістом, у якім распавялі гісторыю ордэна. Заснавальнікам першай картузіі ордэна манахаў-містыкаў быў прафесар Рэймскага універсітэта Бруна. У 1084 годзе ён адчуў прызначэнне да манаскага жыцця і адправіўся ў Альпы, дзе шэсць гадоў займаўся медытацыяй. У мясцовасці Шартрэз Бруна заснаваў першы свой манастыр «La Grand Chartreuse», на латыні — Cartusiae (адгэтуль назва ордэна — картузы, картузіянцы).

Ордэн лічыцца Патрыярхам заходніх манахаў і аўтарам манаскага Статуту, які змяшчае 72 простых запаветы, але яны патрабуюць сталай духоўнай працы, навучання. Вось, да прыкладу, некаторыя з іх. Любіць блізкага, як самога сябе. Не рабіць іншым таго, чаго б мы не жадалі сабе. Адпрэчвацца ад самога сябе. Не прывязвацца да таго, што прыемна пачуццям. Дапамагаць бедным. Падтрымліваць змешчаных у выпрабаванні. Прыпісваць Богу ўсё тое добрае, што знойдзеш у сабе, а ў зле засёды вінаваціць самога сябе. Не гаварыць бяздзейных слоў.

Усё запаветы картузіянцы выконвалі з магчымай строгасцю. Яны елі два разы на дзень, не ўжывалі мяса і тлушчу, іх пост доўжыўся з паловы верасня да Вялікадня, яны клаліся спаць у шэсць вечара, спалі чатыры гадзіны, выходзілі на трохгадзінную службу ў касцёл, потым спалі яшчэ тры гадзіны, іх дзень быў прысвечаны малітве, сузіральнай працы, чытанню, працы ў агародзіку пры сваім эрэме. Раз на два тыдня эрміт голіць галаву і бараду. Картузіянцы не давалі зарок маўчання, але яны тыднямі не прамаўлялі ні слова. Раз на тыдзень ім быў дазволены шпацыр у наваколлях манастыра па вядомым маршруце — ад варот да капліцы за некалькі кіламетраў. Спевы картузаў не суправаджаў арган, яны трымаліся традыцыі харалу. Толькі ў нядзельныя і святочныя дні, калі ў касцёл збіраліся простыя вернікі, служба праходзіла па рымскім рытуале з арганам.

У жыллё манаха з галерэі вёў калідор, па-лацінску — амбулаторыум, на першым паверсе была каморка для дроў, садок, на другім — кубікулум, жылы пакой, у якім размяшчаліся малельня з распяццем, алькоў з нарамі, печ і стол. Галерэя аб'ядноўвала ўсе эрэмы ў камунію.

Картузы ў манастыры насілі белую вопратку і каптуры, якія глыбока насоўвалі на твар, каб не адцягвацца ўвагай на знешні свет. На шпацыр за сцены манастыра або ў пераход са свайго манастыра ў іншы картузіянец апранаў чорную сутану.

У картузіі імкнуліся людзі вызначаных духоўных памкненняў, псіхалагічна і душэўна гатовыя жыць у адхіленасці ад свету. Але што складала прадмет іх роздумаў, што ім адчынялася ў іх сузіраннях — цалкам невядома. Ні іх бібліятэка, ні іх музычныя зборнікі не захаваліся, ва ўсякім разе, лёс іх невядомы.

## Закладнікі

Для годнага ўтрымання манастыра Сапегі прыпісалі да яго некалькі вёсак, мястэчка Бяроза таксама падпарадкоўвалася прыёрству. Манастыру належала немалая гаспадарка — ад цагляна-га цэха да саду і сажалак, разам з зямельнымі ўгоддзямі і кірмашамі яны давалі картузам стабільны прыбытак. Таму спакойны парадак жыцця картузаў часта парушалі аматары пажывіцца.

Падчас вайны Сапегаў з так званымі «рэспубліканцамі» ў кляштар перад Калядамі 1700 года ўвайшлі дзве харугвы канфедэратаў-рэспубліканцаў, якім давялося аддаць акрамя коней і кароў яшчэ 6000 фларынаў. Праз год на манастырскіх землях былі на пастоі ўжо 9 харугваў «рэспубліканцаў», якія старанна рэквізавалі ўсё, што маглі. Асабліва запомніўся картузам май 1706 года, калі іх наведаў шведскі кароль з пяхотным і конным батальёнамі і ўзяў у закладнікі трох эрэмітаў, патрабуючы за іх выкуп у 300 поўных дублонаў, якія павінны аддаць праз тры дні, інача эрэмітаў заб'юць. Картузы ўзялі грошы са скарбніцы і заплацілі за трох манахаў.

У 1708 годзе шведы паўтарылі візіт у картузію і зноў узялі трох закладнікаў, але паколькі дублонаў у скарбніцы не было, манастыр выкупіў братоў за касцельнае літургічнае срэбра. З прычыны гэтага ўзрушэння прыёр і дванаццаць картузіянцаў, пакінуўшы ў сценах кляштара чатырох братоў, сышлі перачакаць бурны час у гданьскую картузію Парадзіс. Праз тры гады яны вярнуліся, але жаданага спакою канец вайны не прынёс.

Вядомая на Палессі Пяцігорская харугва войска ВКЛ у 1715 годзе стаяла зіму ў Бярозе і манастырскіх фальварках, што абышлося картузіі стратамі ў 4050 злотых, у дадатак да якіх былі рэквізаваныя «для пражытку» 100 кароў і 44 авечкі. Прыёр кляштара дасылаў гетману вялікаму літоўскаму просьбу аб кампенсацыі страт, якая, зразумела, была пакінутая без увагі.

## Канец

Паборамі з кляштара адзначаныя 1740-я гады, потым 1760-я, а падчас паўстання 1794 года Тадэвуш Касцюшка даў картузіі распіску, што атрымаў ад манастыра срэбныя і залатыя рэчы коштам каля мільёна злотых. Натуральна, у сувязі з паразай паўстання, палонам Касцюшкі і наступнай яго эміграцыяй ні золата, ні грошы да бярозаўскіх картузаў не вярнуліся.

Пры Мікалаю І, які не меў сентыментаў да каталіцкіх манахаў, мінулыя кантакты картузіянцаў з начальнікам паўстання 1794 года і ўдзел некалькіх манахаў у якасці духоўнікаў у паўстанцкіх атрадах у 1831 года сталіся падставай для ўказу аб ліквідацыі кляштара.

Праз трыццаць гадоў пасля паўстання Каліноўскага асноўныя пабудовы Бярозаўскай картузіі з вялікай акуратнасцю, каб захаваць якасную цэглу, руйнуюць. 54 пахаванні з касцельнай крыпты, у тым ліку 11 трунаў Сапегаў, перанеслі на мясцачковыя могілкі. Гэта адбылося ў 1866 годзе на 200-гадовы юбілей манастыра. Цэгла пайшла на пабудову «чырвоных казарм» і новай праваслаўнай царквы.

* * *

Зараз руіны картузіі адчыненыя і даступныя сузіранню. Можна ўвайсці на вялізны двор, акружаны сцяной, убачыць рэшткі званіцы, прыёрскі двор, кутнюю вежу, пастаяць на тым месцы, дзе некалі былі магілы картузаў. Невядомыя іх імёны — яны былі ананімы.

Бярозаўскія манахі-картузіянцы выпалі з гістарычнай памяці. Нават некаторыя экскурсаводы, тлумачачы падарожнікам, чаму горад зваўся раней Картуз-Бяроза, лічаць магчымым пераказаць недарэчную легенду, што Сувораў павесіў тут на дрэва свой картуз і забыў яго надзець, што і ўвекавечылі жыхары ў назве горада. Мноства людзей гэтаму верыць. Больш узнёслыя гісторыі аб кляштары картузіянцаў пакуль што хвалююць мала людзей.

З НАГОДЫ

# У СПАДЗЯВАННІ НА КАРТ-БЛАНШ

Сяргей ГВАЗДЗЁЎ

**У мінулым годзе прайшло абмеркаванне выставы Нацыянальнага мастацкага музея «Заходняя Беларусь у мастацтве». Здарэнне не дужа маштабнае, але вартае ўвагі. Найперш з-за даты, да якой была прымеркавана выстава, а яшчэ больш — з-за зместу самой выставы.**

Нагадаем, выстава была прымеркавана да ўгодкаў лёсавызначальнай, аднак і вельмі супярэчлівай падзеі 1939 года. Падзеі, пасля якой 14 кастрычніка таго ж векапомнага года Вярхоўны Савет БССР запісаў у законе: «Прыняць Заходнюю Беларусь у склад БССР і з'яднаць тым самым вялікі беларускі народ у адзіную Беларускую дзяржаву».

Наладжаная супольнымі намаганнямі шэрагу ўстаноў Беларусі (Міністэрствам культуры, Нацыянальным музеем гісторыі і культуры, Нацыянальным акадэмічным тэатрам імя Якуба Коласа, Дзяржаўным літаратурным музеем імя Янкі Купалы, Смаргонскім гісторыка-краязнаўчым музеем, Беларускім саюзам мастакоў, Творчым грамадскім аб'яднаннем «Мастак»), выстава была досыць прадстаўнічай. У экспазіцыі было блізка 150 твораў жывапісу і графікі. Усеабдымна шырокая і паліткарэктная назва ў асноўным адпавядала канцэпцыі — з'яднаць рэчышча беларускага мастацтва, раздзеленага палітычнай плацінай геапалітычных варункаў.

Як належыць выставе такога ўзроўню, яна зіхацела суквеццем імёнаў і твораў. Апрача культавых работ заходнебеларускіх класікаў: «Адвечным шляхам», «А хто там ідзе», «Званар» Пятра Сергіевіча, яго графічнага партрэта Івана Луцкевіча, наведвальнікі мелі магчымасць яшчэ раз пабачыць творы Міхася Сеўрука як з пастаяннай экспазіцыі, так і ягоны класічны ўзор сацрэалізму з фондаў НММ — «На сенажаці». Падборку твораў «брэндавага мастака» Язэпа Драздовіча з розных музеяў Мінска, фондавую графіку Зміцера Крачкоўскага, цудоўны жывапіс Ядвігі Раздзялоўскай, бескампрамісна-рэалістычныя партрэты Сяргея Вішнеўскага і паэтычныя краявіды Паўла Южыка з прыватных калекцыяў. Хай і невялічкае адкрыццё зрабілі для сябе гледачы, пабачыўшы некалькі графічных твораў мастакоў «беластоцкага кола».

Ураўнаважвалі «заходнебеларускую плынь» работы «партрэтыста, жанрыста, аўтара карцін на гісторыка-рэвалюцыйную тэму, які маляваў пейзажы, нацюрморты, займаўся графікай, Заслужанага дзеяча мастацтваў БССР (1944), Члена-карэспандэнта АМ СССР (1950), Народнага мастака РСФСР (1966)» — Мадорава Фёдара Аляксандравіча, што быў прадстаўлены партрэтам Сяргея Прытыцкага (1913–1971), эцюдамі і эскізамі да карціны «Народны сход у Заходняй Беларусі».

Выстава атрымалася грунтоўна-шараговай, някідкай і збалансаванай, хоць і без якога буклета-каталога на ўспамін, нягледзячы на ўласны выдавецкі аддзел музея. Гэта меркаванне прысутных мастацтвазнаўцаў, мастакоў, журналістаў і гледачоў («прадстаўнікоў грамадскасці») не варта ўспрымаць як абавязковы і трохі няўклюдны рэверанс у бок арганізатараў.

Зацікаўленыя асобы шукалі адказ на стрыжнявое пытанне: «Чым тлумачыцца абмежаванне паказу (папулярызацыі) заходнебеларускай спадчыны? Чаму хоць раз на 70 гадоў не паказаць яе ў разгорнутым выглядзе? Шырока і панарамна?»

Не пераканалі аргументы арганізатараў на карысць таго, што творы Льва Дабржынскага, Пятра Паўлючука, Пятра Жынгеля, Язэпа Горыда, Кузьмы Чурылы, Клаўдзіі Хруцкай, Эдварда Кучынскага, Валянціна Рамановіча, Яўгена Бранскага на тэрыторыі цяперашняй Беларусі не выяўленыя (але яны ёсць у дзяржзборах суседніх краінаў, прыватных калекцыянераў і спадчыннікаў мастакоў, і гэта ўжо абавязвае і вымагае). Прыкра і крыўдна, што вядомыя ў культурах суседніх народаў мастакі па-ранейшаму невядомыя ў Беларусі.

Тое, што наяўны, дапаможна-дакументальны і «капійны матэрыял» мастацкі музей з-за сваёй спецыфікі паказваць не можа, успрымаецца не больш як роспачна-бездапаможная спроба аргументу.

Гаворачы пра прынцыпы падачы матэрыялу, жывыя формы выставачнай экспазіцыі, аглядальнік аддзела культуры газеты «Свободные Новости +» Ганна Кручоных усхвалявана-захоплена распавядала пра выключна ёмістую і эстэтычную выставу-падзею — «Амерыканскія мастакі з Расійскай Імперыі», у якой, дарэчы, былі заўважаныя і выхадцы з Паўночна-Заходняга краю. Прайшоўшая ў 2009 годзе ў Санкт-Пецярбурзе і Маскве, у філіяле Траццякоўскай галерэі на Крымскім валу выстава была пададзена са скарыстаннем разнастайных дапаможных і метадычна-асветных сродкаў: падборкамі архіўных фотакартак і другіх сведак часу, дакументальных відыяінсталяцый пра мастакоў, не кажучы ўжо пра ўсю шырыню паліграфічнага спектра. (Ад запрашальніка, плаката да выдатнага «павадыра»). Зразумела, такія выставы рыхтуюцца не адзін год і не адным толькі куратарам. Ды і крызіс у нас. У тым ліку фінансавы. Але…

Чым можна растлумачыць адсутнасць у экспазіцыі прац Аляксандра Лазіцкага, Фёдара Лаўрова, Васіля Сідаровіча? Канцэпцыяй, складанасцямі рабочага характару, што маглі паўстаць у музея з прычыны захавання твораў у прыватных калекцыях Беларусі? Тым, што работы ў музей самі не прыйшлі?

Творчы ж даробак таленавітага мастака Антона Карніцкага экспануецца ў Слонімскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі (ёсць яго творы і ў фондах), і тут, здавалася б праблемаў для НММ і МК не існавала. Апрача крызісу, з-за якога, клятага, «няма грошай на бензін». Сапраўды, страшэнны крызіс. І палягае ён, перадусім, у рэчышчы маральна-этычным, духоўным, а не эканамічным. Відаць, гэта і ёсць асноўнае тлумачэнне, чаму выстава, якая мела ўсе магчымасці стаць з'явай культурнага і грамадскага жыцця Беларусі, была ўціснутая ў фармат традыцыйны, дзяжурна-шараговы.

Адкрыццё новых імёнаў, вяртанне іх у культурны кантэкст і грамадскую свядомасць суайчыннікаў, папулярызацыя заходнебеларускай неабжытай духоўнай спадчыны, якая, акрамя ўласна мастацкай вартасці, мае дакументальную і гісторыка-культурную значнасць — справа неабходная. Дзяржаўная.

Праміну́ўшая выстава не стала значнай грамадска-культурнай падзеяй краіны. Але яна пакінула буйнейшай мастацкай установе РБ і Міністэрству культуры зайздросную магчымасць на годны карт-бланш. У 2014 годзе. Рыхтавацца да яго трэба ўжо зараз.



Міхась Сеўрук. «Купальніцы»



Язэп Горыд. «Маланка»



Пётр Сергіевіч. «Утаймаванне буры»

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 32
Падпісана да друку 15.01.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.